◂ №32 (160)
◂ 4 ВЕРАСНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ПАРАНОІК**

Стар. 14

**ВАРЫЯНТЫ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ**

5 верасня адбудзецца чарговы з'езд партыі БНФ — палітычнай структуры, пра якую так ці інакш ведаюць ва ўсёй Беларусі

Стар. 4

**ПЕРАМОГА НАД МАСКВОЙ**

1 верасня ў Расіі быў не толькі Дзень ведаў, але і дзень праверкі лаяльнасці малых этнасаў да нацыянальна-культурнай палітыкі федэральнага цэнтру

Стар. 13

**КРЭСКІ ДА ПАРТРЭТА МАСТАЧКІ СА СЛОНІМА**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Шчасце / няшчасце**

**17 верасня**

**Роздум Анатоля Тараса**

▸ КРЫЗІС

# АПТЫМІЗМ НА АБРЫВЕ

Алена ЗАПАЛЯНСКАЯ, Вольга ХВОІН

**У Міністэрстве эканомікі Беларусі лічаць, што станоўчыя змены будуць ужо восенню. Аднак афіцыйная інфармацыя Мінстату гаворыць, што паказчыкі развіцця па асобных пунктах скараціліся ў разы. Наўрад ці атрымаецца выправіць гэту сітуацыю цягам бліжэйшых месяцаў.**




«Многія краіны адзначаюць спыненне рэцэсіі, ажыўленне эканомік, таму думаю, увосень пачнуць адбывацца станоўчыя зрухі, мы чакаем паляпшэння становішча з адмоўным сальда знешняга гандлю», — адзначыла намеснік міністра эканомікі Таццяна Старчанка. Яна дадала, што ёсць добрыя перадумовы павялічэння аб'ёму экспарту. Паводле разлікаў Мінэканомікі, за студзень — ліпень гэтага года адмоўнае сальда гандлёвага балансу вырасла да 3,1 мільярда долараў. Гэта выклікана падзеннем як фізічных аб'ёмаў экспарту, так і цэн на тавары, што экспартуюцца.

Аднак варта дадаць, што скараціўся не толькі аб'ём экспарту, але і вытворчасць. Прырост валавога ўнутранага прадукту за першыя шэсць месяцаў склаў усяго толькі 0,4 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. Падчас другой агляднай місіі МВФ змяніла ацэнкі па ВУП на гэты год, якія сталі бліжэйшыя да прагнозных паказчыкаў Міністэрства эканомікі Беларусі. У адпаведнасці з чэрвеньскім прагнозам МВФ, у 2009 годзе ў Беларусі чакаецца падзенне ВУП на 3,3 працэнта. Цяпер Мінэканомікі плануе да канца года рост ВУП на ўзроўні 1–2 працэнты і гатовае выканаць рэкамендацыю МВФ і адмовіцца ад давядзення да прыватных прадпрыемстваў прагнозаў росту вытворчасці.

Найбольшае падзенне аб'ёмаў вытворчасці, паводле афіцыйнай інфармацыі, зафіксавана ў прамысловасці і вытворчасці нехарчовых тавараў, рост — у хімічнай прамысловасці (на 32,4 працэнта), нафтаперапрацоўцы (на 19,9 працэнта), паліўнай і харчовай прамысловасці. Старчанка адзначыла, што цяпер ключавая задача для прадпрыемстваў — «пашырэнне геаграфіі рынкаў продажу». «У асноўным усе нашы галіны маюць стратэгіі экспартнага продажу, якія ўключаюць мерапрыемствы па стварэнні новых таваралправодных сетак, пашырэнне формаў разлікаў, выкарыстанне лізінгу для прасоўвання нашай прадукцыі на расійскі рынак», — падкрэсліла намеснік міністра. Цяпер рыхтуюцца дакументы і будзе створана кампанія, якія зоймецца продажам беларускай прадукцыі ў лізінг.

На сёння Мінэканомікі прапрацоўваецца магчымае падвышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду. Яно можа адбыцца ўжо ў гэтым годзе, але пра суму, па словах намесніка міністра, пакуль гаварыць рана. У той жа час пры падрыхтоўцы праекта бюджэту Беларусі на наступны год разглядаецца магчымасць падвышэння падатку на дабаўленую вартасць. Пры гэтым можа быць зніжаны падатак на прыбытак і будуць адменены некаторыя мясцовыя падаткі.

Сёлета ў Беларусі больш за ўсё падаражэлі паслугі, менш — харчовыя тавары (адпаведна 11,9 і 6,2 працэнта). За сем месяцаў гэтага года выраслі інвестыцыі ў асноўны капітал 17,8 працэнта ў параўнанні з тым жа перыядам мінулага года. У аб'екты вытворчага прызначэння інвестыцыі павялічыліся на 20,3 працэнта.

Застаецца высокі ўзровень складскіх запасаў, але за ліпень яны знізіліся на 6,3 працэнта. Запасы гатовай прадукцыі ў прамысловасці Беларусі па выніках сямі месяцаў 2009 года склалі 88,3 працэнта сярэднямесячнага аб'ёма вытворчасці. Палова запасаў прыходзяцца на машынабудаўнічую прадукцыю (аўтамабілі).

Сярод негатыўных тэндэнцый гэтага года — павелічэнне колькасці вымушаных адпачынкаў. У рэжыме няпоўнай занятасці па ініцыятыве наймальнікаў працавалі 135,1 тысячы чалавек, што амаль у чатыры разы больш, чым у аналагічным перыядзе мінулага года.

«У цэлым вынікі дастаткова някепскія, — лічыць намесніца міністра эканомікі. — Я думаю, што прынятыя ўрадам антыкрызісныя меры дазволілі забяспечыць такое стабільнае развіццё эканомікі». Аднак захады дзяржавы не ў поўнай меры падтрымлівае МВФ. У заключэнні экспертаў гаворыцца, што беларускаму ўраду варта «скараціць да мінімуму кантроль за цэнамі, каб цэнавыя сігналы маглі накіроўваць плынь рэсурсаў і дапамагаць карэктаваць лішак і недахоп рэсурсаў у эканоміцы; таксама варта адмяніць большасць абмежаванняў па розвнічных гандлёвых надбаўках у адпаведнасці з дамоўленасцямі, дасягнутымі паміж урадам і Сусветным банкам».

Сярод слабых месцаў называецца давядзенне абавязковых для выканання колькасных мэтавых паказчыкаў на макраэканамічным узроўні і ўзроўні прадпрыемстваў, сістэма дырэктыўнага крэдытавання, а таксама стымуляванне ўнутранага попыту на фоне слабага плацежнага балансу. Эксперты МВФ прыйшлі да высновы, што на працягу сямі месяцаў бягучага года працягваўся высокі рост крэдыту эканоміцы, чаму спрыяла крэдытаванне ў рамках дзяржпраграм, часта пад працэнтныя стаўкі, што датакова субсідзіруюцца.

Варта адзначыць і той факт, што ўлады не гатовыя да рэальнай лібералізацыі эканомікі, таму што гэта парушыць выбудаваную гадамі жорсткую сістэму дзяржаўнага кіравання і кантролю. Між іншым, насуперак аптымістычным прагнозам Мінэканомікі пра паляпшэнне сітуацыі восенню, прафесар Ельскага ўніверсітэта (ЗША) Алег Цывінскі агучыў свае разлікі, паводле якіх Беларусь напрыканцы гэтага года толькі дасягне дна эканамічнага крызісу.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Тры вечары запар у дварах Кастрычніцкага раёна Віцебска праходзілі выступленні Народнага тэатра гістарычнага касцюма «Полацкі звяз».

Перад жыхарамі навакольных дамоў артысты, апранутыя ў рыцарскія даспехі і сярэднявяковае адзенне, гралі сцэны з далёкага мінулага, праводзілі рыцарскія турніры і гуртавыя баі — бугурты. Дзяўчаты ўсіх жадаючых навучалі старадаўнім танцам. Мясцовыя жыхары вадзілі карагоды, і самымі актыўнымі ўдзельнікамі ў іх прымалі дзеці. З наступленнем цемры артысты паказвалі непаўторнае «Вогненнае шоу», якое было кульмінацыяй тэатральных выступаў.

### ЛЕЛЬЧЫЦЫ. ВОЗЕРА ЗАСТАНЕЦЦА ЗАБРУДЖАНЫМ

Месяц таму мясцовы актывіст Мікалай Гаўрыленка звярнуўся ў райвыканкам з прапановай ачысціць возера Мох, якое знаходзіцца ў цэнтры горада, і арганізаваць там зону адпачынку. І нарэшце атрымаў адказ за подпісам старшыні райвыканкама Аляксандра Капыткова, дзе паведамлялася, што добраўпарадкаваць вадаём немагчыма, пакольку ў бюджэце на гэта адсутнічаюць сродкі.

### МАСТЫ. ЗНІШЧАНА ПАМЯЦЬ

На Мастоўшчыне, як і паўсюдна па Беларусі, выпілоўваюць старыя дрэвы. Гэта акцыя нядаўна прайшла ў мястэчку Лунна. Яна закранула былую сядзібу яго ўладальніка Ромера. Месца знакамітае тым, што тут на працягу многіх гадоў праводзіла лета знакамітая пісьменніца, удзельніца вызвольнага паўстання 1863 года Эліза Ажэшка, якая ў многіх сваіх творах апісвала парк гаспадара. Векавыя дрэвы — сведкі даўніны — ператварыліся ў звычайныя дровы.

### ЛІДА. ФЭСТ БАЙКЕРАЎ

У горадзе прайшоў трэці міжнародны фестываль байкераў. Каля трохсот матацыклістаў з'ехаліся сюды з шасці краінаў: Беларусі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Расіі. Звычайна фестываль тут праводзіцца ў апошні выходны дзень лета і завяршае сезон беларускіх байкераў.

Абавязковая частка фэсту — рок-канцэрт. Тут байкеры не толькі слухаюць музыку, паказваюць свае машыны, але і спаборнічаюць фізічна. Спаборніцтва дзіўнае — хто далей кіне рухавік свайго байку. Адбылася сустрэча ўдзельнікаў фэсту з сябрамі мясцовага рыцарскага клуба. Сярод іншага байкеры паказалі сваё майстэрства. Вечарам адбыліся арыгінальныя спаборніцтвы ў хуткасці бегу з курамі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# Найджэл Гулд-Дэвіс: КАНТРАСТ ПАМІЖ ІМІДЖАМ БЕЛАРУСІ І РЭАЛЬНАСЦЮ АШАЛАМЛЯЕ

**Надзвычайны і паўнамоцны пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Найджэл Гулд-Дэвіс пакінуў нашу краіну ў сувязі з завяршэннем сваёй дыпламатычнай місіі. Літаральна за некалькі гадзін да адлёту, на прэс-канферэнцыі ён прызнаўся журналістам, што не хоча адсюль з'язджаць, а ранейшае сваё рашэнне пра абмежаванне тэрміну працы ў Беларусі толькі двума гадамі назваў «самай вялікай прафесійнай памылкай».**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Найперш яго ўразілі беларусы сваёй «прыстойнасцю, спакойнай годнасцю, павагай, з якой людзі ставяцца адзін да аднаго». «Калі я сустракаюся з замежнікамі, якія першы раз прыехалі сюды, адно з першых іх уражанняў — якая прыгожая краіна, якія цудоўны горад і, самае галоўнае, якія дзіўныя, унікальныя людзі. Атрымліваецца, што мы, замежнікі, уражаныя ашаламляльным кантрастам паміж іміджам і рэальнасцю ў Беларусі», — падкрэсліў дыпламат.

Акрамя цудоўных людзей, дыпламата прываблівае і той факт, што праца цяпер, пасля паляпшэння адносінаў з ЕС, больш цікавая. «Мы здзейснілі своеасаблівы прарыў, і гэта вымагала значных высілкаў. Цяпер ёсць разуменне, што прагрэс магчымы. Гэтага разумення раней не было», — адзначыў спадар Гулд-Дэвіс.

Аднак, паводле яго слоў, «у Еўрасаюза цяпер ёсць некаторая занепакоенасць з-за таго, што ў апошні час не бачны прагрэс у Беларусі, які быў раней. Беларусь зрабіла летась вызначаныя крокі для наладжвання адносін з ЕС. Мы спадзяёмся на працяг, таму што гэта будзе карысна для Беларусі. У цэлым Еўрасаюз спадзяецца на з'яўленне пастаяннай пазітыўнай дынамікі».

Гулд-Дэвіс нагадаў, што ў лістападзе Еўрасаюз і ЗША будуць разглядаць пытанне аб санкцыях у дачыненні Беларусі. «Калі Беларусь зацікаўленая ў пазітыўным рашэнні, то было б карысна рабіць тое, што трэба», — заўважыў ён. Пазіцыя ЕС адносна пераменаў у Беларусі была агучаная раней і застаецца нязменнай: рэформа выбарчага заканадаўства, забеспячэнне свабодаў і роўных умоў для дзейнасці СМІ і грамадзянскай супольнасці.

Уключэнне Беларусі ў праграму «Усходняе партнёрства», па словах дыпламата, сведчыць пра гатоўнасць Еўрасаюза да далейшага супрацоўніцтва.

Разам з тым спадар Найджэл Гулд-Дэвіс звярнуў увагу журналістаў, што Еўрасаюз не вядзе з Расіяй барацьбу за ўключэнне Беларусі ў сваю сферу ўплыву: «Гэта хібны і шкодны спосаб мыслення. Еўрасаюз — гэта інстытут XXI стагоддзя, а не дзяржава XIX стагоддзя. ЕС запрашае і прапаноўвае, але не пагражае і не прымушае. Мы былі б рады бачыць, што ў Беларусі складваюцца выдатныя адносіны як з дзяржавамі ЕС, так і з іншымі краінамі. Мы не лічым, што гэтыя рэчы выключаюць адна адну».

***

Новы Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі прыедзе ў Беларусь у сярэдзіне верасня. Місію Вялікабрытаніі ў Беларусі ўзначаліць Размары Томас. Раней яна працавала ў аддзеле Foreign-офіса, які спецыялізаваўся на краінах постсавецкай прасторы. Размары Томас з'яўляецца кар'ерным дыпламатам і працуе ў МЗС Вялікабрытаніі ад 1991 года.

ПАМЯЦІ КАЛЕГІ

# БАЖ РАЗВІТВАЕЦЦА З ДЗМІТРЫЕМ ПАРФІНОВІЧАМ

**30 жніўня нечакана спынілася сэрца Дзмітрыя Парфіновіча, сябра ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў». Яму было ўсяго 47 гадоў.**

Дзіма працаваў у нашай арганізацыі з першага дня яе заснавання. Ён не быў публічнай асобай, але яго ведалі багата усе сябры БАЖа — і ў Мінску, і ў рэгіёнах. Не толькі таму, што ён выконваў безліч самых розных арганізацыйных спраў. Дзіма быў чалавекам, да якога заўсёды можна было звярнуцца па дапамогу, параду, падтрымку.

Пайшоў з жыцця вясёлы, адкрыты, добразычлівы чалавек. Наш сябра, наш паплечнік.

Калектыў офіса БАЖ — гэта не проста кола супрацоўнікаў. Гэта адна сям'я, у якой людзі звязаныя самымі цёплымі і блізкімі стасункамі і дзе кожную страту перажываюць як асабістае гора.

Мы ўсе горка смуткуем разам з блізкімі Дзімы і выказваем шчырае спачуванне яго родным і сваякам.

Яго будзе страшэнна не хапаць кожнаму з нас.

Светлая табе памяць, Дзіма, і нізкі паклон.

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»**

# ДЗІМА, ДЗІМКА, ЗМІЦЕР…



Пайшоў ты... Так, пайшоў. Туды, адкуль я Цябе не магу дазвацца…

Ні ўчора, ні сёння. І не дазавуся. Магчыма, Ты будзеш спрабаваць нешта перадаць Ірыне, майму цёзку і тваму сыну, дачцэ і нявестцы, і нават будучым Тваім унукам і ўнучкам…

Плынь свядомасці ў мяне зараз. Ты пакінуў нас у той момант, калі патрэбныя былі Твае слова і Твае дзеянні і парады…

Спі спакойна, Чалавек, я буду да Цябе заходзіць, і мы будзем з Табою гутарыць, я Табе буду распавядаць пра ўсё, што адбылося ў гэтым свеце. Дзімка, я з Табою, і сустрэнемся ў Вялікшага…

**Гена Кеснер**

ЭКСПЕРЫМЕНТ

# СЕЛЬСАВЕТАЎ СТАНЕ МЕНШ

**Сяргей СЕМЯНОВІЧ, Бялынічы**

**У прэсе можна было сустрэць інфармацыю пра эксперымент па аб'яднанню маланаселеных сельсаветаў, распачаты ў мінулым годзе ў Віцебскай вобласці.**

І вось стала вядома, што гэту ініцыятыву збіраецца падтрымаць і Магілёўская вобласць. Спачатку планавалася пачаць працу па аб'яднанню сельсаветаў ужо зараз, але, у сувязі з тым, што восенню будзе праводзіцца перапіс насельніцтва, вырашана адкласці пачатак працэсу аб'яднання.

Зараз супрацоўнікі сельвыканкамаў знаходзяцца ў разгубленасці з-за нявызначанасці свайго далейшага лёсу. Большасць з іх працуюць на сваіх пасадах доўгія гады, атрымліваючы за сваю працу нядрэнны заробак і зарабляючы так званы «стаж дзярслужачага», які дае магчымасць датэрмінова выйсці на пенсію.

**Даведка**

Зараз у нашым рэгіёне дзейнічаюць наступныя сельскія саветы:

Бялыніцкі раён — 8 сельскіх саветаў: Вішоўскі, Галоўчынскі, Запольскі, Ланькаўскі, Лебедзянкаўскі, Машчаніцкі, Цяхцінскі, Эсьмонскі.

Круглянскі раён — 7 сельсаветаў: Комсеніцкі, Круглянскі, Кручанскі, Ляснянскі, Рубежскі, Цяцерынскі, Шапялевіцкі.

Шклоўскі раён — 12 сельскіх саветаў: Александрыйскі, Ардацкі, Гарадзецкі, Гарадзішчанскі, Заходскі, Каменна-Лаўскі, Рыжкавіцкі, Славенскі, Старасельскі, Талкачоўскі, Фашчаўскі, Чорнаручскі.

АБ'ЯВА

# ТРЫНАЦЦАТЫ РАЗ НА МАЙСТАР-КЛАС

**Маладыя гродзенцы, якія хочуць паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы, могуць падаваць заяўкі на ўдзел у праекце «Школа маладога журналіста–13».**

ШМЖ — гэта унікальная школа ў Беларусі, дзе выкладаюць журналісты-практыкі. За 12 год яе прайшлі больш з 250 хлопцаў і дзяўчат. Некаторыя з іх сталі лаўрэатамі нацыянальных і міжнародных узнагарод у галіне журналістыкі. Выпускнікі ШМЖ працуюць сёння ў газетах «Вечерний Гродно», «Гродзенская праўда», «Перспектива», «Наша Ніва», «Белорусы и Рынок», на тэлеканале ОНТ, а таксама ў замежных СМІ.

Праект складаецца з тэарэтычнага і практычнага блокаў. Тэарэтычная частка будзе прысвечана асновам журналістыкі («Уводзіны ў журналістыку», «Прававыя і этычныя аспекты працы журналіста», «Жанры журналістыкі», «Асаблівасці газетнай, радыё- і інтэрнэт-журналістыкі» і многія іншыя).

Практыку навучэнцы праходзяць у рэдакцыі інтэрнэт-газеты і радыё «Твой стыль».

Да ўдзелу ў праекце «ШМЖ–13» запрашаюцца юнакі і дзяўчаты ад 16 да 25 гадоў.

Заявы на ўдзел можна запоўніць **з 2 да 21 верасня** па адрасе: **Гродна, вул. Будзёнага, 48а–11, з 12:00 да 17:00** (акрамя суботы і нядзелі).

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах: **(+375 29) 784-32-21, 106-85-94.**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СЫШЛІ Ў НЕБА...

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Трагедыя — гэта заўсёды трагедыя. Але вельмі шкада, што яна становіцца галоўнай навіной тыдня, якую працягваюць абмяркоўваць усе і ўся. І абмяркоўваюць не адзін дзень. І будуць абмяркоўваць надалей. У Радаме (Польшча) падчас выканання дэманстрацыйнага палёту разбіўся беларускі шматфункцыянальны знішчальнік Су–27УБ. Абодва пілоты загінулі.**

Падчас выканання фігур вышэйшага пілатажу знішчальнік пачаў губляць вышыню. Пілоты Су–27УБ — лётчыкі-снайперы Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч — прынялі рашэнне не катапультавацца, а адвесці самалёт на максімальна магчымую адлегласць ад населенага пункта. Цаной свайго жыцця беларусы прадухілілі больш цяжкія наступствы катастрофы.

Палкоўнік Аляксандр Марфіцкі з'яўляўся намеснікам камандуючага Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ВПС і войск СПА, палкоўнік Аляксандр Жураўлевіч — намеснікам камандзіра 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы (ЗАБ) у Баранавічах (Брэсцкая вобласць).

Гэта трэцяя аварыя з удзелам ваенных самалётаў у гісторыі суверэннай Беларусі, у якой загінулі пілоты. Першая адбылася 23 мая 1996 года. У ёй загінуў начальнік паветрана-агнявой і тактычнай падрыхтоўкі 61-й ЗАБ падпалкоўнік Уладзімір Карват. Цаной свайго жыцця лётчык адвёў самалёт, які загарэўся, ад населеных пунктаў. Указам прэзідэнта Карвату, першаму ў краіне, было прысвоена званне Героя Беларусі (пасмяротна). Другая аварыя адбылася 19 мая 1997 года ў раёне Баранавічаў. Су–17, які разбіўся, пілатаваў падпалкоўнік Сяргей Паграбан. Прычыны яго гібелі не абнародаваліся.

30 жніўня Мінабароны Беларусі агучыла папярэднюю прычыну катастрофы — траплянне птушкі ў паветразаборнік рухавіка знішчальніка. Замежныя СМІ вылучылі і іншыя версіі: памылка пілотаў пры выкананні фігуры вышэйшага пілатажу на невялікай вышыні і страта прытомнасці адным з лётчыкаў.

Канешне, у прычынах катастрофы разбярэцца адмысловая камісія. Але нешта ўсё ж падаецца дзіўным. Па-першае, хуткасць, з якой беларускае Мінабароны выказалася пра папярэднюю версію крушэння: без экспертызаў, без расшыфроўкі «чорных скрыняў», без анічога. Па-другое, Су–27УБ — гэта знішчальнік-«усенадворнік», які павінен лётаць пры любым надвор'і, ці то снег, ці то град, ці то пясчаная бура. Заваліцца ад адной птушкі? Вельмі сумнеўна. Па-трэцяе, з кулуараў прасачылася інфармацыя, што з Адміністрацыі прэзідэнта ваенным настойліва параілі «не раздзьмухаць» тэму катастрофы.

У Баранавічах каля авіязаводу вісеў плакат з выявай таго самага 63-га борта. 2 верасня, перад прылётам целаў загінуўшых пілотаў, на плакаце замалявалі лічбу «63»... Ці не крыўдна?

Але больш крыўдна за каментары на шматлікіх форумах, якія абмяркоўвалі катастрофу. Нечакана чамусьці большасць стала намякаць на дрэнную падрыхтоўку пілотаў (хаця лётчык-снайпер — вышэйшая прафесійная кваліфікацыя), нешматлікую колькасць налёту (у першага пілота — 2,5 тысячы гадзін налёту, у другога — 1600), дрэнную тэхніку (самалёт перад адпраўкай на авіяшоу прайшоў мадэрнізацыю). І дакаціліся да таго, што ўвогуле нашы лётчыкі, — не героі, а ахвяры абставінаў.

Да чаго ж мы сябе не любім! Нават у геройскім учынку шукаем нешта дрэннае. Нават калі самі палякі прызнаюць геройскі ўчынак нашых лётчыкаў, мы ўсё роўна займаемся самапрыніжэннем. Дарэчы, для ўдзелу ў вайсковым рытуале развітання прыбыў камандуючы ВПС Польшчы Анджэй Бласік, а таксама рота ганаровай варты Войска Польскага. А гэта ўжо — не хухры-мухры.

3 добрых навінаў можна адзначыць адну. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка становіцца сапраўдным беларусам. У першы дзень новага навучальнага года ён узяў удзел у цырымоніі адкрыцця Цярэблікага беларускамоўнага навучальна-педагагічнага комплексу яслі — сад — сярэдняя школа ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці.

Важна тут тое, што комплекс — цалкам беларускамоўны. Здаецца, па ўсёй краіне такіх комплексаў няма. Можа, гэты ўчынак паспрыяе пашырэнню беларускамоўнага навучання па ўсёй краіне?

Цікавая навіна прыйшла са Злучаных Штатаў. 1 верасня амерыканскае выданне «The Virginian-Pilot» паведаміла пра тое, што суд штата Вірджынія асудзіў 27-гадовага Пятра Баравіка на пяць гадоў пазбаўлення волі.

Асуджаны быў падначаленым іншага беларуса, Віктара Круся, які атрымаў сем гадоў пазбаўлення волі ў ліпені гэтага года. Баравік прызнаў сябе вінаватым у тым, што ўдзельнічаў у пастаўцы нелегальных працоўных у гасцініцы і рэстараны пад кіраўніцтвам Круся і яшчэ аднаго лідэра групоўкі. Следства выявіла, што Баравік агулам зарабіў на нелегалах каля 233 тысяч долараў.

Пётр Баравік прыехаў у ЗША ў 2003 годзе. Ён разам з шэрагам іншых людзей (іх імёны пакуль не называюцца) атрымалі палітычны прытулак у 2004 годзе як удзельнікі апазіцыйнай арганізацыі «Зубр».

«Зубр» спыніў сваё існаванне яшчэ ў 2006 годзе. Але дагэтуль яго дзейнасць адгукаецца па ўсіх частках свету. На шчасце, следства ўстанавіла, што Крусь і Баравік не ўваходзілі ў палітычную арганізацыю «Зубр» і іх не пераследавалі за палітычную дзейнасць. Так што беларуская апазіцыя і былыя «зуброўцы» могуць быць спакойныя.

І яшчэ адна прыкольная навіна. Беларусь не адмовілася ад вытворчасці «мабільных кірпідонаў». Прадпрыемства «Мастоўская сельгастэхніка» да канца года плануе наладзіць выпуск мабільных тэлефонаў для пенсіянераў.

Як паведаміў начальнік спецыялізаванага цэха № 2 па вытворчасці тэлефонаў і жгутоў прадпрыемства «Мастоўская сельгастэхніка» Сяргей Міцкевіч, праект па вытворчасці недарагіх сотавых тэлефонаў знаходзіцца на стадыі распрацоўкі. Чакаецца, што ў новых мабільнікаў для пенсіянераў будзе мінімальны набор функцый. Як паведаміў дырэктар прадпрыемства «Мастоўская сельгастэхніка» Мікалай Лісай, адной з галоўных будзе з'яўляцца функцыя SOS, дзе запраграмуюць найбольш важныя нумары для пажылых людзей. Таксама для больш камфортнага выкарыстання ў мабільных апаратаў зробяць вялікія кнопкі і вялікі экран. Апрача таго, паводле слоў дырэктара завода, тэлефон будзе максімальна даступны па цане для мэтавай аўдыторыі.

3 гэтай ідэяй «дагонім і перагонім Siemens і Nokia» беларускія ўлады насіліся даўно. Але цікава, колькі будзе важыць падобны апарат і ад якой сім-карткі ён будзе працаваць? «Бест» жа ўжо прадалі туркам, і на яго месцы даўно ўжо Life:).



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### КАЦЯРЫНА КАРСТЭН



Двухразовая алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн шосты раз выйграла золата на чэмпіянаце свету па акадэмічным веславанні ў класе лодак-адзіночак. У фінальным заездзе сусветнага форуму ў польскай Познані беларуска пераадолела 2 000 метраў за 7 хвілін 11,78 секунды. Больш за палову дыстанцыі Карстэн трымалася на чацвёртай пазіцыі, але на фінішы дабілася перамогі. Срэбра першынства планеты ў Познані заваявала брытанка Кэтрын Грэйнжэр, бронза дасталася чэшцы Мірке Кнапковай (7 хвіл. 16,22 сек.).

Кацярына Карстэн — першая і адзіная двухразовая алімпійская чэмпіёнка (1996, 2000) у гісторыі незалежнай Беларусі; шасціразовая чэмпіёнка свету (1997, 1999, 2005–2007, 2009) у веславанні на адзіночцы. Заслужаны майстар спорту СССР. З 1997 года жыве ў Германіі.

### ВАЛЯНЦІН СТАНКЕВІЧ



Дзесяцікласнік Валянцін Станкевіч заваяваў гран-пры на міжнародным фэсце народнай творчасці для асобаў з абмежаванымі магчымасцямі. Валянцін Станкевіч выканаў на фартэпіяна твор Іосіфа Гайдна «Саната-партыта», які адпавядае ўзроўню 5-га класа музычнай школы для звычайных дзяцей. Хлопчык таксама стаў дыпламантам фэсту як вакаліст.

Валянцін — старэйшы з чатырох хлопчыкаў у сваёй сям'і. Ён нарадзіўся сляпым, але з надзвычайным талентам. У школе ў дзіцяці выявілі абсалютны слых, а таксама вельмі добрую памяць. Каб мець магчымасць «чытаць» творы, ён асвоіў нотны брайль. А цяпер вучыць музыку па начытаных на дыктафон нотных запісах. Для Валянціна фартэпіяна — другі інструмент, першы — баян. Малады музыка грае на прафесійным піцірадным баяне, у ягоным рэпертуары — паўтарагадзінная праграма з твораў узроўню складанасці музычнай вучэльні. Акрамя баяна, Валянцін грае на трубе, выступае з духавым аркестрам школы. Юнак таксама піша вершы на беларускай, рускай і польскай мовах. Плануецца, што восенню Валянцін Станкевіч возьме ўдзел у міжнародным творчым конкурсе ў Любліне.

Першы міжнародны фэст народнай творчасці для асобаў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя праходзіў у Маскоўскім сацыяльна-гуманітарным інстытуце. У ім узялі ўдзел каля 320 талентаў ва ўзросце ад 14 да 30 гадоў. Акрамя Валянціна Станкевіча яшчэ трое гродзенскіх дзяцей сталі дыпламантамі фэсту: дзесяцікласніца школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку Вікторыя Глінская ў намінацыі «мяккая цацка», а таксама дзевяцікласніцы са школы для дзяцей з парушэннямі слыху Аміля Шрэйдэр з працай з пацерак і Ксенія Саліхава з жэставай песняй.

### КАСЯ ГАЛІЦКАЯ



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Актывістку «Маладой Беларусі» Касю Галіцкую звольнілі з працы пасля візіту да кіраўніцтва супрацоўніка Камітэта дзяржбяспекі. Дзяўчына працавала перакладчыцай у замежнай фірме, якая займалася продажам сельскагаспадарчай тэхнікі. Дырэктар фірмы не меў прэтэнзій да выконваемай працы, але ўсё адно быў вымушаны звольніць супрацоўніцу. Касю Галіцкую падобным чынам звальняюць з працы другі раз. Раней не папрасілі сысці з яшчэ адной недзяржаўнай фірмы, якая займалася выпускам паліграфічнай прадукцыі. З-за яе палітычнай дзейнасці ў дзяўчыны калісьці былі праблемы і па вучобе. Кася Галіцкая доўгі час была актыўным сябрам незарэгістраванай у Беларусі арганізацыі «Малады фронт». Неаднаразова адбывала пакаранне ў следчым ізалятары на Акрэсціна.

З'ЕЗД

# ВАРЫЯНТЫ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

**5 верасня адбудзецца чарговы з'езд партыі БНФ — палітычнай структуры, пра якую так ці інакш ведаюць ва ўсёй Беларусі. Чакаецца, што ў з'ездзе прымуць удзел каля 360–370 дэлегатаў. Будзе разглядацца два асноўных пытанні: вылучэнне кандыдата ад партыі на наступныя прэзідэнцкія выбары і абранне новага старшыні. Уласна кажучы, інтрыга маецца толькі ў другой частцы. Цяперашні кіраўнік партыі Лявон Баршчэўскі збіраецца сыходзіць са старшынства на іншую «пасаду» — у кандыдаты на прэзідэнцкі фатэль. На пасаду старшыні партыі цяпер прэтэндуюць два намеснікі: Аляксей Янукевіч і Віктар Івашкевіч. Гавораць, што прыхільнікаў абодва маюць пароўну, усё вырашыцца галасаваннем тых, хто не яшчэ вызначыўся.**

**Аляксей Янукевіч — з плыні маладых апазіцыйных палітыкаў, якія сталі на крыло і хочуць весці за сабой, а не ісці за кімсьці. Віктар Івашкевіч у беларускай палітыцы адзін са старажылаў. Напярэдадні з'езду партыі журналіст «НЧ» Вольга Хвоін паспрабавала даведацца пра мары палітыкаў і іх бачанне сітуацыі ў партыі.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Віктар Івашкевіч



Аляксей Янукевіч

***— Як можна ахарактарызаваць апошнія паўтара гады кіравання партыяй Лявонам Баршчэўскім?***

***Аляксей Янукевіч:*** Лявон Баршчэўскі прыйшоў на старшынства пасля дастаткова доўгага перыяду, калі ён не прымаў удзел у кіраўніцтве партыі. І яго лінія ў значна меншай ступені, у адрозненні ад Вінцука Вячоркі, была залежнай ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Цэнтр прыняцця рашэнняў стаў бліжэй да Фронту — гэта першая і пазітыўная адметнасць. Спадар Баршчэўскі адкрыта дэклараваў падчас свайго абрання, што будзе наводзіць парадак у партыі, гэтым і займаўся, у сваім разуменні. Была ў яго і спроба выбудаваць жорсткую партыйную вертыкаль. Асноўным парушальнікам спакою ў партыі выступаў Алесь Міхалевіч. Баршчэўскі са згоды Вінцука Вячоркі здолеў прапанаваць і правесці рашэнне пра выключэнне Алеся. Але час паказаў, што справа была не ў Міхалевічу, і спатрэбіліся больш глыбокія «чысткі». Лявон Пятровіч быў гатовы пайсці далей у гэтым, але яго не падтрымала большасць партыйцаў. Таму навесці той парадак, які ўяўляўся, не атрымалася.

***Віктар Івашкевіч:*** Як спробы навядзення дысцыпліны і парадку ў структуры.

***— У якім стане партыя знаходзіцца цяпер?***

***А. Я.:*** Адчуваецца ўнутраная напруга. І на гэтым з'ездзе яна мусіць неяк вырашыцца. Але я спадзяюся, што расколу не будзе, бо Фронту няма куды дзяліцца далей. Я перакананы, што пасля з'езда гэта напруга сыдзе на нуль. Падкрэслю, што падзелу на два лагеры, моцнага супрацьстаяння ў самой партыі няма. Гэта ёсць толькі на ўзроўні кіраўніцтва.

***В. І.:*** Партыя знаходзіцца на раздарожжы. Ёсць тыя, хто прапануе дзейнічаць з пазіцыі, што Лукашэнку не зменіць, таму трэба прыстасоўвацца да рэжыму і пакрысе яго цывілізаваць. Ёсць другая пазіцыя: эканамічны крызіс нам Бог дае для таго, каб зрабіць трансфармацыю не чакаючы. Вось з гэты шляхоў і будзем абіраць на з'ездзе. Калі аддаць перавагу першаму шляху, то не трэба працаваць з рабочымі, а варта ісці ў выканкамы на ўмовах прымакоў і прасіцца ў кансультанты. Другі — вымагае працы з сацыяльнымі групамі.

***— Што можна сказаць наконт філій партыі?***

***А. Я.:*** Я мушу прызнаць, што сёння камунікацыя паміж цэнтрам і рэгіёнамі кепская. Рэгіёны не вельмі цікавяцца тымі рашэннямі, што прымаюцца ў цэнтры і не вельмі натхнёнаў іх выконваюць. Што тычыцца дзеяздольнасці структураў, то я б сказаў так: усё пазнаецца ў параўнанні. У нас самыя разгалінаваныя і дзеяздольныя рэгіянальныя структуры з усіх апазіцыйных сілаў. Калі гаварыць пра магчымасць рэальна ўплываць на сітуацыю, праводзіць якасныя выбарчыя кампаніі, то не кожная філія на такое здольная, тым больш, калі б трэба было прасоўваць не аднаго, а дзесяць чалавек. Але філіі жывыя. Нават калі недзе ёсць толькі тры-пяць чалавек, то гэта людзі, якія гатовыя працаваць апантана. Хаця ёсць рэгіёны, дзе на сходы па вылучэнню дэлегатаў на з'езд прыходзіла некалькі дзесяткаў чалавек. Натуральна, мы павінны ставіць сабе на мэце павялічваць колькасць сябраў партыі.

***В. І.:*** Там, дзе партыйныя актывісты сядзяць на НДАшных грантах, там больш прыстасавальніцкіх настрояў, а дзе людзі працуюць на прадпрыемствах, рэальна адчуваюць жыццё, там настрої больш рэвалюцыйныя. Відаць, яны не лунаюць у аблоках, а бачаць рэальны стан рэчаў.

***— Якое месца партыя займае ў Аб'яднаных дэмакратычных сілах?***

***А. Я.:*** БНФ выконвае цяпер ролю своеасаблівага хрыбта АДС, бо партыя была адным з ініцыятараў стварэння кааліцыі, цягнула вялікую частку працы. Разам з тым палітычны ўплыў БНФ у АДС цяпер недапушчальна малы. Мы маем яўную меншасць разам з іншымі нацыянал-дэмакратычнымі сіламі ў радзе аб'яднаных Дэмсілаў. На сённяшні момант нельга гаварыць пра тое, што развіццё АДС істотна адпавядае інтарэсам партыі.

***В. І.:*** Ключавое месца. Без БНФ няма АДС. Аляксандр Мілінкевіч і яго паплечнікі гавораць пра стварэнне правай кааліцыі, але без БНФ яе не будзе. Так склалася аб'ектыўна, што ў нас партыя можа і не такая моцная, як у 1990-я, але лепшая за іншыя. Ёсць патэнцыял. Лічу, што трэба працаваць з сацыяльнымі групамі, выходзіць да людзей. Калі мы ператворымся ў НДА, то гэта фактычна шлях да самаізаляцыі і згасання.

***— Супрацьстаянне паміж партыяй БНФ і рухам «За свабоду» перыядычна абвастраецца. У чым, на вашу думку, прычыны гэтага?***

***А. Я.:*** Стасункі паміж партыяй і рухам складваюцца кепска, хаця вялікая колькасць нашых сябраў у рэгіёнах супрацоўнічае з Рухам. Я лічу, што сітуацыя патрабуе выпраўлення ў тым плане, што мы мусім дамаўляцца пра супольную дзейнасць, кампаніі. Абсалютна не нармальна, калі ў нас атрымліваецца весці дыялог з камуністамі, сацыял-дэмакратычнымі партыямі, і немагчыма наладзіць стасункі з Рухам «За свабоду», Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй. Прычына гэтага мне бачыцца ў тым, што пасля завяршэння прэзідэнцкай кампаніі 2006 года Фронт не здолеў прыдумаць формулу, як акумуляваць грамадскую энергію, што тады вызвалілася. Я не магу сказаць, што вельмі эфектыўна спрацаваў Рух, але, прынамсі, яны імкнуліся ахапіць гэтых людзей. Магчыма, актыўнасць Руху і нашая немабільнасць справакавала пачуцці канкурэнцыі.

***В. І.:*** Кіраўніцтва руху хоча паставіць партыю пад свой кантроль, зрабіўшы яе служкай на пабегушках. А прыхільнікі аўтаноміі гэтага не прымаюць. Праблема яшчэ ў тым, што Рух імкнецца паўсюль паспець: і грамадская арганізацыя, і палітычная, і праваабарончая. Гэта спекуляцыя, тры пашпарты ў адной кішэні. Праблема і тое, што нашы сябры партыі ў гэта ўцягваюцца, а гэта, у сваю чаргу, падрывае дзейнасць, накіраваную на супрацоўніцтва з грамадствам.

***— Калі вы ўзначаліце партыю, што зменіце ў першую чаргу?***

***А. Я.:*** Мы павінны пачаць з таго, што цалкам мусім памяняць падыход да нашага планавання. Дагэтуль планаванне дзейнасці адбывалася ад адной палітычнай кампаніі да другой, у прамежках дзейнасць зварочваецца. Таксама варта адкінуць ілюзіі адносна таго, што мы нечага дамагаліся на пачатку 1990-х вызначанымі сродкамі і метадамі, і зараз яны спрацуюць. Таксама варта пазбавіцца ад чакання, што адбудзецца эканамічны крах, людзі масава выйдуць, і гэта дазволіць змяніць палітычны рэжым. Лічу, што планы мусяць складацца на поўны палітычны цыкл — чатыры-пяць гадоў, павінны ставіцца высокія, амбітныя мэты, але дасягальныя. Напрыклад, прыцягненне новых людзей, і не проста людзей, а тых, хто гатовы прынесці з сабою новыя ідэі. Улада цяпер, нягледзячы на сваю грувасткасць, куды больш дынамічная і гібкая за нас. Мы мусім ставіць сабе мэту павелічэння папулярнасці ў грамадстве. Каб, скажам, праз некалькі год пра БНФ людзі гаварылі штодня. Мы мусім паказаць людзям, што БНФ — мае ясныя каштоўнасці і можа абараняць штодзённыя інтарэсы людзей. Важна пазбавіцца ад іміджу вечных паражэнцаў, які нам навесіў Лукашэнка. Для гэтага варта ўстрымлівацца ад абвяшчэння мэтаў, калі загадзя вядома, што мы іх не зможам выканаць. Мусім накапіць менавіта багаж поспеху.

***В. І.:*** Я буду вылучацца на кіраўніка партыі толькі тады, калі з'езд вылучыць Лявона Баршчэўскага ў кандыдаты. План маёй дзейнасці — разгарнуць шырокую кампанію, якая дапаможа прыцягнуць сацыяльна незадаволеныя слаі грамадства. Калі з'езд падтрымае гэта — будзем працаваць, а кіраўніцтва партыі будзе ў штабам. Калі не, то я не планую вылучацца

***— Што з гэтага рабілася апошнія гады?***

***А. Я.:*** Апошнія гады Фронт знаходзіўся ў рэчышчы АДС, пераважная частка нашых энергіі і сілаў сыходзіла менавіта на раскрутку гэтай структуры. АДС у пэўным сэнсе ўзмацніліся, але карысці менавіта партыі ад гэтага не было. І людзі паступова пачалі забываць пра партыю, яе ідэі. Таму цяпер варта скіраваць высілкі менавіта на адраджэнне Фронту.

***В. І.:*** Па маёй ініцыятыве БНФ браў на сябе арганізацыю масавых акцый — Дня Волі, Чарнобыльскага шляху. Толькі мы збіралі такія масавыя акцыі. Усе яны суправаджаліся інфармацыйнымі кампаніямі. Цяпер створаны аргкаміт па правядзенню Кангрэсу прадстаўнікоў працоўных калектываў. Такім чынам мы сцвярджаем сваё лідэрства і ініцыятыву, праўда за гэта ж часта і маем крытыку. Але трэба мець на ўвазе, што такая дзейнасць блакавалася прадстаўнікамі Руху, якія з'яўляюцца сябрамі партыі.

***— Якой бачыцца канцэпцыя ўдзелу партыі ў прэзідэнцкіх выбарах?***

***А. Я.:*** На гэтым этапе адзінае, што нас павінна турбаваць, гэта ўмовы, на якіх будуць адбывацца гэтыя выбары. Фармат нашага ўдзелу мы мусім вырашыць пазней, гэта справа вясны наступнага года. Трэба сфармуляваць галоўнае патрабаванне: уключыць нашых людзей у выбарчыя камісіі і дапусціць да кантролю за падлікам галасоў. Калі мы гэтага дасягнём, то мае сэнс выстаўляць свайго кандыдата. Але тады не будзе мець сэнсу вылучаць кандыдата ад АДС, тым больш што і працэдура гэтая наўрад ці будзе канчаткова ўзгодненая.

***— Як адчуваеце сябе ў беларускай палітыцы?***

***А. Я.:*** Палітыка — гэта тая сфера дзейнасці, якая мне падабаецца. Разам з тым у Беларусі палітыкі як такой няма, апазіцыя ад яе адлучаная. Натуральна, ёсць моцнае жаданне, каб мы вярнуліся ў палітыку і змаглі ўплываць на падзеі і рашэнні, што прымаюцца. Я лічу сябе моцнай натурай і нейкіх дэпрэсій з нагоды, што не атрымліваецца рэалізаваць свае планы ў мяне не здараецца. Хутчэй ёсць здаровая злосць і жаданне дамагчыся свайго.

***В. І.:*** Сённяшнія ўмовы палітыкі ўспрымаю як рэчаіснасць, дадзенасць. Таму ёсць свае стрэсы, і радасці. Гэта жыццё.

***— Ці ставіце сабе мэту прыйсці да ўлады і кім сябе бачыце ў будучыні?***

***А. Я.:*** Канешне, як мінімум — спікерам парламенту, як максімум — прэм'ер-міністрам ці прэзідэнтам.

***В. І.:*** Натуральна, калі я заяўляю, што нам трэба ісці на выбары і перамагчы, то маецца на ўвазе, што трэба будзе працаваць ва ўладзе. Але як жаўнер партыі я сыходжу з меркавання, куды пашлюць — тым і буду займацца.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ЯК ВЫЛЕЧЫЦЬ ПАЛІТЫЧНЫ «НЕЎРОЗ»

Вольга ХВОІН

**Пакуль Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў у Сочы вырашалі будучыню АДКБ і размаўлялі наконт будаўніцтва беларускай АЭС, у Мінску высвятлялі, у якім рэчышчы мусяць развівацца адносіны паміж дзвюма дзяржавамі-суседкамі. «Беларусь — Расія: ракіроўка ці перазагрузка?» — на такое пытанне спрабавалі адказаць прадстаўнікі апазіцыйных палітычных сілаў Беларусі і Расіі падчас аднайменнай канферэнцыі. Неблагія высновы, яркія асобы, але адзін мінус: рэальна ні беларуская, ні расійская апазіцыя на міжнародную палітыку сваіх дзяржаў не ўплывае. Прадстаўнікі ўладаў канферэнцыю праігнаравалі.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Характэрна, што і беларускі і расійскі бакі сышліся ў шэрагу тэзаў, як то: змены ў Расіі ў дэмакратычным кірунку пацягнуць адпаведныя рэформы ў Беларусі; аўтарытарныя рэжымы не могуць дамаўляцца, бо на першае месца выступаюць не законнасць і правы, а ўнутраныя амбіцыі і жаданне дэманстраваць сілу.

Што тычыцца перспектыў Саюза, аб'яднаннях двух юрыдычна незалежных дзяржаў, то варта прызнаць, што яны даўно перайшлі ў шэраг пустых абяцанак. Беларусы не бачаць сябе ў складзе Расіі. Важна, што прадстаўнікі расійскай палітычнай апазіцыі ўжо прызнаюць Беларусь як краіну з правам на суверэнітэт.

Адносіны нашых суайчыннікаў да магчымага аб'яднання з Расіяй прадэманстраваў сацыёлаг, дырэктар сацыяметрычнай лабараторыі «Новак» Андрэй Вардамацкі. Паводле даследаванняў, геапалітычная арыентацыя беларусаў зведала некалькі этапаў развіцця. Для 2000-га — першай паловы 2004 года была характэрная роўнанакіраванасць на Усход і Захад. Аднак пасля пашырэння Еўрапейскага саюза ў 2004 годзе і пад уздзеяннем негатыўнай інфармацыі беларускіх СМІ пачаўся рост прарасійскай арыентацыі.

У 2007 годзе пасля шэрагу палітычных і эканамічных канфліктаў з Расіяй (найперш «газавай вайны») працэнт тых, хто арыентуецца на ўсходнюю суседку, зменшыўся на 10 працэнтаў. Адначасова беларусы пачалі больш пільна прыглядацца да Захаду. Да гэтага часу мы жывем у стадыі зацікаўленасці еўрапейскім курсам. Між іншым, за ўваходжанне Беларусі ў склад Расіі на правах федэрацыі выступаюць толькі пяць працэнтаў жыхароў «сінявокай», а 74,1 працэнта лічаць, што Беларусь павінна быць незалежнай.

Рэчаіснасць вымагае ад Расіі прымірыцца з фактам, што Беларусь наўрад ці ўвойдзе ў яе склад, і што калісьці стане сябрам ЕС і NATO. Кіраўніцтву Расіі, як адзначыў палітык Леанід Гозман, варта пазбавіцца ад «неўрозу» і асэнсаваць, чаго ж яно ўвогуле хоча ад адносін з Беларуссю.

«Нельга сказаць, што ў Расіі і Беларусі вельмі дрэнныя ўзаемаадносіны. Паміж Расіяй і Украінай, Расіяй і Грузіяй стасункі значна горшыя, з Грузіяй мы нават ваявалі, — праводзіў асацыятыўныя паралелі Гозман. — Расія і Беларусь паводзяць сябе як муж і жонка, якія і разысціся не могуць, і жыць разам не здольныя, таму ператвараюць сваё жыццё ў пекла. Доказ гэтаму — крыўды адзін на аднаго, пастаяннае высвятленне таго, чаму партнёр, суччын сын, такі няўдзячны. З расійскага кіраўніцтва хто-небудзь пачынае гаварыць: вось мы вам столькі далі, а вы нават Абхазію прызнаць не хочаце. Хоць, падавалася б, чаго б у вас абламалася прызнаць Абхазію? Хаця незразумела, як бы нам стала лепш ад гэтага».

Фінансавыя датацыі з боку РФ беларускаму рэжыму ствараюць канфлікт інтарэсаў у самой Расіі. «Агулам РФ выдзеліла Беларусі каля 120 мільярдаў рублёў крэдыту. Ці значаць для Расіі штонебудзь гэтыя грошы? У гэтым годзе расійскі ўрад адмовіўся ад падвышэння зарплаты. 120 мільярдаў рублёў — гэта для рэгіёнаў пад'ём заробка прыкладна на 6,6 працэнта», — заявіў экс-намеснік міністра фінансаў РФ Сяргей Аляксашанка. Паводле яго меркавання, выдача крэдытаў і іх вяртанне — прадмет палітычнага гандлю, які неаднойчы будзе выкарыстаны бакамі ў сваіх інтарэсах. Пры гэтым і Расія, і Беларусь пакуль што занадта залежныя адна ад адной, каб хутка вырашыць усе канфліктныя пытанні. Беларусь энергетычна залежыць ад Расіі, апошняя, у сваю чаргу, залежыць ад транзіту па тэрыторыі Беларусі.

Замест падсумавання варта прывесці словы Леаніда Гозмана: «Яшчэ адна праблема расійскага грамадства ў плане расійска-беларускіх адносін складаецца ў непавазе да Беларусі. Ёсць меркаванне, што беларуская дзяржава — гэта штосьці штучнае і выпадковае. Ну, хлопцы, вось вам проста пашанцавала незразумела з чаго. З якой, наогул, радасці Беларусь — дзяржава? Вось гэта распаўсюджаны пункт погляду ў Расіі. І негатыў у дачыненні да Лукашэнкі ў расійскай ліберальнай частцы грамадства пераносіцца калі не на беларускі народ, то на беларускую культуру, беларускую гісторыю і дзяржаўнасць». Партнёры, якія не паважаюць адзін аднаго, наўрад ці будуць весці справы адкрыта і начыстую. Адсюль пастаянныя канфлікты і гульні на «апярэджванне» з жаданнем выкарыстаць палітычнага хаўрусніка і адначасова апанента, а заадно і выйсці ў дамкі.

МЕРКАВАННЕ

# Барыс Нямцоў: ДЭМАКРАТЫ Ў РАСІІ НІКОЛІ НЕ БЫЛІ ПРЫ ЎЛАДЗЕ

**Адным з удзельнікаў Міжнароднай канферэнцыі «Беларусь — Расія: ракіроўка ці перазагрузка» быў вядомы расійскі палітык, былы сустаршыня Саюза правых сіл, экс-віцэ-прэм'ер расійскага ўраду, экс-міністр паліва і энергетыкі і былы губернатар Ніжагародскай вобласці Барыс Нямцоў. У перапынку паміж пасяджэннямі форума палітык адказаў на пытанні карэспандэнта «НЧ» Генадзя Кеснера.**

***— Барыс Яфімавіч, як так склалася, што «правыя» ў Расіі страцілі ўладу?***

— Справа ў тым, што дэмакраты ў Расіі пры ўладзе асабліва ніколі і не былі, калі не лічыць рамантычнага часу жніўня 1991 года. Ужо ў 1992 годзе прэм'ерміністрам стаў Чарнамырдзін, якога нават чыста візуальна цяжка назваць дэмакратам. Апроч таго, на долю расійскіх дэмакратаў выпала самая цяжкая і няўдзячная праца. Трэба было з рэанімацыі ратаваць краіну, якая там апынулася пасля банкруцтва і распаду СССР. І вы самі ведаеце, што з рэанімацыі ружовашчокім яшчэ ніхто не выходзіў — усе такія бледнаватыя і кепска стаяць на нагах. То бок, нам выпала зрабіць усю чарнавую працу. І гэта адна з прычын таго, што дэмакраты не кіравалі краінай.

Другая прычына — расійскім дэмакратам не моцна пашчасціла. Напрыклад, калі я быў міністрам паліва і энергетыкі, нафта каштавала дзесяць долараў за баръль. Зараз у Пуціна — семдзесят пяць, і ён б'ецца ў істэрыцы, што ў яго дэфіцытны бюджэт, спад ВУП на дзесяць працэнтаў і гэтак далей. Мы захавалі Расію пры дзесяці доларах. Натуральна, гэта было вельмі цяжкае жыццё. Людзі, тым не менш, ніяк не атаясамліваюць кошты на нафту са сваім рэальным жыццём. Маўляў, прыйшоў Пуцін, і жыць стала лягчэй. А тое, што калі прыйшоў Пуцін, і так супала, нафта стала даражэйшай, яны здагадацца не могуць.

І трэцяя прычына — гэта такая гебельсаўска-пуцінская прапаганда супраць ліберальных каштоўнасцяў, якую ён праводзіць апошнія дзесяць гадоў, ненавідзячы ўсё жывое, усё, што вакол, уключна суседзяў. Так што тут прапагандысцкі эфект таксама мае вялікае значэнне.

***— Звернемся да пытання так званага «дуумвірата». Натуральна, у першыя дні і нават месяцы было зразумела, што Дзмітрый Мядзведзеў не зможа праводзіць уласную палітыку. Але прайшло ўжо багата часу, ці змянілася што-небудзь у гэтым сэнсе, ці мае Мядзведзеў рэальную ўладу ў Расіі?***




Фота Юрыя Дзядзінкіна

— Не. Пуцін доўга выбіраў чалавека слабага, лаяльнага і не здольнага кіраваць краінай. І ён яго знайшоў — гэта Мядзведзеў. Гэты чалавек не здольны паўнавартасна кіраваць дзяржавай, быць дзеяздольным прэзідэнтам. Уласна, яго місія ў тым, каб быць шырмаю. Праблема ў іншым, праблема ў тым, што такая руская традыцыя на працягу стагоддзяў — хто ў Крамлі, той і ўлада, гэта легітымная пасада прэзідэнта, якая легітымна ўжо тысячу гадоў існавання Расіі, — гэта традыцыя парушаецца дзеля амбіцыяў Пуціна з-за яго жадання застацца пры ўладзе. Апроч таго, ён растоптае Канстытуцыю, бо, паводле Асноўнага закону, Расія — прэзідэнцкая краіна, і ён яе растаптаў разам з традыцыяй.

Гэта, натуральна, вельмі кепска, таму што і без таго ў нас дзяржава вельмі карумпаваная і неэфектыўная, а з улікам гэтай канстытуцыйнай і гістарычнай турбулентнасці яна стала яшчэ больш слабай. Дзяржава агрэсіўная, але слабая.

***— А апошнія заявы Мядзведзева, напрыклад, наконт Украіны — гэта яго спробы паказаць сябе моцным кіраўніком ці штосьці іншае?***

— Не, ён спрабуе. Але я скажу інакш: чым слабейшы чалавек, тым больш грознымі мусяць быць яго прамовы. Увогуле, калі размаўляюць сур'ёзныя людзі, яны размаўляюць напаўголаса, не размахваюць рукамі, і кожнае іх слова фіксуецца. Вось, напрыклад, калі Бернанке (кіраўнік Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША) абвяшчае стаўку рэфінансавання і колькі будзе надрукавана амерыканскіх долараў, то ён гаворыць гэта вельмі ціха. Але чамусьці ўсе сусветныя рынкі і ўся сусветная эканоміка на гэта бурна рэагуюць.

А калі Мядзведзеў піша Ючанку грозныя лісты, то, за выключэннем Украіны, дзе ўсё ж ідзе выбарчая кампанія, больш на гэта ніхто ўсур'ёз не рэагуе, бо ўсе разумеюць, што гэта або танны піяр, або няўклюдныя спробы паўплываць на сітуацыю ў іншай краіне. Дарэчы, і ў нас у Расіі на гэта сур'ёзна не рэагуюць.

***— Ці не баіцца кіраўніцтва Расіі наступіць на адны і тыя ж граблі, калі падчас папярэдніх прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне яны адкрыта падтрымалі аднаго кандыдата, а перамогу атрымаў зусім іншы?***

— Ведаеце, разумны вучыцца на ўласных памылках, а дурань увогуле не вучыцца. Калі б улады былі разумныя, то яны б тую ганебную гісторыю 2004 года, якую вы прыгадалі, не захацелі б паўтарыць. Але, мяркуючы па гэтых дзеяннях, падаецца, што яны ніякіх высноваў не зрабілі.

А ўвогуле, расійская праблема ў тым, што ў нас чым даражэйшая нафта, тым дурнейшы ўрад. У нас IQ урада адваротна прапарцыйны кошту на нафту. Паколькі зараз нафта каштуе 75 долараў за баръль (а гэта сапраўды дорага), то, канешне, патрабаваць ад уладаў аналізу, у тым ліку і ўласных памылак, было б, верагодна, заўчасна.

ПРАБЛЕМА

# ІЗГОЙ ЦІ ЧАСТКА ГРАМАДСТВА?

Вольга ХВОІН

**Дыскрэдытацыя грамадзян у Беларусі паводле тых ці іншых прыкметаў не з'яўляецца паказчыкам недасканаласці дзяржавы. Гэта з'ява характарная для грамадства, пачынаючы ад старажытных часоў. Іншая справа, як соцыум на яе рэагуе, ці гатовы змагацца з праявамі дыскрымінацыі.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

У Беларусі рэдка гаворыцца пра дыскрымінацыю паводле прыкметаў полу ці нацыянальнасці. Куды часцей звяртаецца ўвага на «асаблівыя адносіны» да людзей з фізічнымі ці псіхічнымі асаблівасцямі, папросту кажучы — інвалідаў.

Беларусь плануе далучыцца да Канвенцыі аб правах інвалідаў, якая была прынятая Генеральнай асамблеяй ААН у 2006 годзе з мэтай заахвочвання, абароны і забеспячэння поўнага і роўнага ажыццяўлення інвалідамі ўсіх правоў чалавека і асноўных свабодаў. Дакумент падпісалі каля 140 дзяржаў. Старшыня асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Сяргей Драздоўскі лічыць намеры беларускай дзяржавы далучыцца да канвенцыі станоўчым фактам.

У беларускім Законе «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў» існуе норма, якая прадугледжвае іх абарону ад дыскрымінацыі. Цяпер рыхтуецца да прыняцця новая рэдакцыя закона, якая выключае гэтую норму і прадугледжвае, што беларускае заканадаўства будуецца на прынцыпах недыскрымінацыі. Разам з тым артыкул 22 Канстытуцыі Беларусі прадугледжвае, што «ўсе роўныя перад законам і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў».

Аднак старшыня Беларускага таварыства інвалідаў Уладзімір Патапенка адзначае, што шэраг падзаконных актаў зводзіць на нуль тое, што прапісана ў асноўным заканадаўстве. Напрыклад, існуе шэраг абмежаванняў для прыёму ў навучальныя ўстановы, на працу, санаторна-курортнае аздараўленне і гэтак далей. У якасці прыкладаў прыводзіліся выпадкі адмовы ў аздараўленні інваліду ў доме адпачынку, у прыёме на навучанне.

«У многіх выпадках дыскрымінацыйныя матывы вельмі важныя. Размова часта ідзе не пра камфортнасць жыцця, а выжыванне ўвогуле. Палітыка недыскрымінацыі інвалідаў мусіць рэалізоўвацца на дзяржаўным узроўні», — падкрэслівае старшыня асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Сяргей Драздоўскі. Умовы жыцця не дазваляюць інвалідам у поўнай меры інтэгравацца ў соцыум. Вядомы выпадак, калі інваліды не змаглі патрапіць у рэканструяваны будынак Опернага тэатра з-за парушэння нормаў будаўніцтва і невыканання правілаў безбар'ернага асяроддзя.

Сяргей Драздоўскі падаў у суд на дзеянні ахоўніка тэатра оперы і балета, палічыўшы іх дыскрымінацыяй сваіх правоў. Аднак у судзе нічога даказаць не атрымалася. «Суддзя сказала, што нават калі б яна пагадзілася з фармуліроўкай аб дыскрымінацыі, то не змагла б прымяніць ні адну норму з дзеючага заканадаўства, — расказвае Драздоўскі. — Калі былі парушаныя мае правы, мне самому трэба адсочваць ланцужок гэтых парушэнняў і выяўляць, на падставе якіх заканадаўчых актаў правы мусяць выконвацца».

На словах мы ўсе супраць дыскрымінацыі. Аднак калі размова вядзецца пра канкрэтныя выпадкі дыскрымінацыі, то не кожны можа цвёрда акрэсліць сваё стаўленне да сітуацыі. Прычына гэтаму — забабоны і стэрэатыпы, якія маюць месца ў грамадстве. Напрыклад, яшчэ ад савецкіх часоў засталося ўяўленне пра інвалідаў як пра непаўнавартасных людзей, якім патрэбна шкадаванне. Зрэшты, гэта ж выхоўвае ў апошніх спажывецкія адносіны, калі не прывіваецца імкненне быць паўнавартасным суб'ектам грамадства, які мае права на ўдзел у культурным, сацыяльным, палітычным жыцці краіны.

«Лічыцца, што ў інвалідаў меншыя патрэбы ў наведванні тэатраў, ім трэба менш вопраткі, меншыя патрэбы ў атрыманні адукацыі. У выніку нават скарочаны іх спажывецкі кошык. Не ўлічваецца і той факт, што інвалідам патрабуецца адмысловае медычнае абслугоўванне і грошы на яго», — адзначае старшыня Беларускага таварыства інвалідаў Уладзімір Патапенка. Разам з тым пагоршыліся ўмовы для стымуляцыі працы інвалідаў. «Раней інваліды, якія працуюць, мелі права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне нароўні з іншымі людзьмі, якія маюць інваліднасць. Цяпер яны могуць толькі выкупляць пуцёўкі. У Законе аб упарадкаванні льгот палёгкі пакінулі толькі непрацуючым інвалідам», — патлумачыў Патапенка.

Паводле падлікаў спецыялістаў Банка рэканструкцыі і развіцця, з-за няўцягнутасці інвалідаў у вытворчыя працэсы, сусветная эканоміка за апошнія дзесяцігоддзі недаатрымала прыблізна каля двух трыльёнаў долараў.

ПРАЕКТ

# У СТАРЫМ ЛЕПЕЛІ БУДУЮЦЬ БУДУЧЫНЮ

Генадзь КЕСНЕР

**У вёсцы Стары Лепель (Лепельскі раён Віцебскай вобласці) ужо шмат гадоў ажыццяўляецца праект па будаўніцтву жылля для сем'яў перасяленцаў з паўднёвых раёнаў Беларусі, якія найбольш пацярпелі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Адметнасць гэтага праекта ў тым, што ажыццяўляюць яго не ўрадавыя структуры, а простыя людзі з Беларусі, Германіі, а з апошняга года — і з Італіі. У Старым Лепелі адчыніўся Культурна-адукацыйны цэнтр, які па сучасных экалагічных тэхналогіях сумесна будавалі спецыялісты і валанцёры з Германіі і Беларусі.**

Практычна ўвесь жнівень у Старым Лепелі на базе Міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «ЭкаДом» маладыя энтузіясты з Мінску, а таксама з італьянскага Палерма (Сіцылія) і валанцёры з розных гарадоў Германіі рэалізоўвалі праект, прысвечаны вырашэнню праблем пераадолення наступстваў катастрофы на ЧАЭС і пытанням энергетычнай эфектыўнасці.

Моладзь аказвала актыўную дапамогу ў будаўніцтве экалагічных дамоў для маладых перасяленцаў з забруджаных радыяцыяй раёнаў. Як паведаміў журналістам, што прыехалі ў Стары Лепель на цырымонію адкрыцця Культурна-адукацыйнага цэнтра, кіраўнік праекта «Дамы замест Чарнобыля» Дзітрых фон Бодэльшвінг, будаўніцтва самых першых дамоў для перасяленцаў на поўначы Беларусі пачалося яшчэ ў далёкім 1991 годзе. На сённія ў раёне возера Нарач і пад Лепелем пабудаваныя ўжо пяцьдзесят такіх дамоў. Перад тым, як пачаць праект, немцы дасканала вывучылі экалагічную сітуацыю ў рэгіёне, правялі замеры ў розных раёнах, і толькі пасля гэтага Лепельскі раён быў абраны для будаўніцтва пасёлка для перасяленцаў.

Па словах спадара Бодэльшвінга, мэта праекта — не толькі будаўніцтва дамоў для людзей з забруджаных тэрыторый, але і стварэнне інфраструктуры, магчымасцяў для таго, каб людзі, што пакідаюць свае родныя мясціны, на новым месцы пачуваліся сапраўды дома, каб яны знайшлі сваю другую малую радзіму. «Канцэпцыю праекта можна вызначыць так: мы будуем разам — гэта валанцёры з Германіі і Беларусі, якія цягам трох тыдняў знаходзяцца ў гэтым лагеры і бяруць удзел ва ўзвядзенні каркаса дома», — распавядае германскі кіраўнік праекта.

Але самае важнае, адзначае Дзітрых, гэта тое, што да будаўніцтва прыцягваюцца і тыя, каму пазней давядзецца жыць у гэтых дамах. «Людзі, якія сюды пераязджаюць, а гэта людзі менавіта з забруджаных тэрыторый, бо мы самі вядзем адбор, — на гэтым месцы гер Бодэльшвінг зрабіў асаблівы акцэнт, — самі мусяць разам з намі цэлы год адпрацаваць на будоўлі аж но да завяршэння будаўніцтва дома».

Аўтары праекта ўпэўнены, што непасрэдны ўдзел перасяленцаў — будучых гаспадароў дамоў дапаможа ім найхутчэй адаптавацца да новых умоваў, знайсці паразуменне з будучымі суседзямі, сваімі рукамі будуючы сваю будучыню. А на маю асабістую думку, гэта яшчэ і адвучванне нашых суайчыннікаў ад славутай «халявы», да якой мы прызвычаіліся за савецкія і постсавецкія часы (у якасці прыкладу можна прывесці стаўленне грамадзян да так званых аграгарадкоў, створаных дзяржавай за грошы падаткаплацельшчыкаў, адкуль людзі бягуць наўскапыта, бо ім асабіста нічога не каштавала атрыманае жыллё).

Каб пазбегнуць памылак ужо ўзгаданых мною аграгарадкоў, арганізатары праекта вырашылі не толькі ўзводзіць хаты, але і ствараць на месцы адпаведную інфраструктуру. Так, часткай гэтай інфраструктуры і стаўся Культурна-адукацыйны цэнтр, збудаваны таксама валанцёрамі ды фаховымі спецыялістамі з Германіі па сучасных энергазберагальных тэхналогіях. Менавіта на яго адкрыццё і прыехалі не толькі сталічныя журналісты, але і дзесяткі гасцей з Італіі і Германіі — тыя, хто ахвяраваў грошы на праект, дапамагаў у яго рэалізацыі маральна і тэхнічна і нават непасрэдна сам браў удзел



у яго рэалізацыі. Прыехалі і старыя, і малыя.

Сам дом, дзе месціцца цэнтр, нагадвае невялікі палац культуры, але адметнасць яго перад усім у тым, што ён фактычна сам будзе сябе забяспечваць цяплом і энергіяй. Германская фірма Paradigma Energie- und Umweltschutz GmbH, прадстаўнік якой Томас Нойер прысутнічаў на адкрыцці цэнтра, у якасці дабрачыннага ўнёска перадала для абсталявання будынка сонечны калектар вакуумнага тыпу для нагрэву вады (сонечная батарэя месціцца на даху), а таксама кацёл на драўляных гранулах-пілетах з аўтаматычнай падачай паліва і сістэму аўтаматычнай тэрмарэгуляцыі будынка. Па словах германскіх спецыялістаў, такая сістэма дазваляе эканоміць да сарака працэнтаў цяпла ў параўнанні са звычайнымі памяшканнямі.

На адкрыццё Культурна-адукацыйнага цэнтра прыбылі і некаторыя афіцыйныя асобы з раёна і нават з Мінска ў асобе начальніка ўпраўлення па гуманітарнай дзейнасці ўпраўлення справамі прэзідэнта Уладзіміра Рыжанкова. «Тое, што ўжо зроблена — вось гэты маленькі будынак за нашай спінай, — сёння сапраўды адыгрывае вельмі вялікую ролю ва ўмацаванні нашых братэрскіх сувязяў», — заявіў спадар Рыжанкоў, звяртаючыся да прысутных германскіх гасцей і ўдзельнікаў праекту падчас цырымоніі адкрыцця цэнтра. А намеснік Лепельскага райвыканкама Мікалай Нікіцін адзначыў, што маладыя людзі з розных краін, занятыя ў рэалізацыі праекта, могуць не толькі сумесна працаваць, але і вучыцца паважаць адзін аднаго. «А гэта вельмі важна для разумення мінуўшчыны і для пабудовы будучыні», — падкрэсліў Мікалай Нікіцін.

Праект у Старым Лепелі працягваецца. Пра тое, што ён мае перспектывы (у планах арганізатараў — будаўніцтва яшчэ дзесяці дамоў для перасяленцаў, а таксама аб'ектаў інфраструктуры), сведчыць не толькі гатоўнасць дарослых нямецкіх і беларускіх мужчын і жанчын аказваць актыўнае спрыянне, але і шчырае стаўленне да гэтага маладога пакалення як беларусаў, так і італьянцаў, і немцаў. Адзначу толькі адзін факт: нягледзячы на тое, што звычайная валанцёрская змена доўжыцца тры тыдні, прычым некаторыя маладзёны жывуць наўпрост у намётах, бальшыня з іх застаецца на два і нават на тры тэрміны, і многія заяўляюць, што абавязкова прыедуць у Стары Лепель і на наступны год.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 7 верасня, панядзелак

---

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.35** «Здароўе».
**10.00** «Жыццё як жыццё». Жаночае ток-шоў.
**11.00** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-3» (Расія).
**12.10** Іранічная камедыя «Квартэт для дваіх» (Украіна).
**13.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**14.30** Культурныя людзі.
**15.10, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Мары спраўджваюцца. Мінск-Вена». Відэафільм АТН.
**15.50** Авантурна-прыгодніцкі серыял «Каралі гульні» (Расія).
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-3» (Расія).
**18.45** Відэафільм АТН «Бялыніцкія таямніцы» цыклу «Зямля беларуская».
**19.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ланцуг» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.35** Баявік «Вікінг» (Расія). 1-я серыя.
**00.25** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Тэорыя неверагоднасці.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер.фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Дэсантура». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.15** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Насланне». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Фільм «Паглядзі на мяне». Францыя-Італія, 2004г.
**15.30** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартыўны тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Насланне». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**20.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Мядовы месяц». Расія, 2004 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**23.05** «Сталічны футбол».
**23.35** «Гучная справа».
**00.25** «Next 2». Серыял. Закл. серыя.

---

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Усё аб бяспецы.
**08.50** У гэты дзень.
**08.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.55** Драма «Місіс Браун» (Вялікабрытанія- Ірландыя-ЗША).
**12.40** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**14.10** Бітва экстрасэнсаў.
**15.00** Мультфільм.
**15.10** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.35** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Тэлебарометр.
**16.05** Экспедыцыя.
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дакументальна-камедыйны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада).
**19.35** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Кінараман «Крах інжынера Гарына» (СССР). 1-я серыя.
**22.15** Хакей. Формула гульні.
**22.45** Прыгодніцкі баявік «Механік» (Германія-ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял.
**10.05** «Іван Грозны з душой Дон Кіхота. Мікалай Чаркасаў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя пошта».
**12.00** Рамантычная камедыя «Вялікае каханне». Расія, 2005 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Самая прыгожая-2».
**15.10** Прэм'ера. «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі».
**22.30** Тэлесерыял «Самая прыгожая-2».
**23.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі+».
**00.15** «Дзяжурны па краіне».

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Асабліва небяспечны!».
**09.10** Дак. фільм «Чапаева ліквідаваць!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.15** «Кулінарны паядынак».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.30** Серыял «Мянтоўскія войны».
**22.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.20** «Сумленны панядзелак».
**00.15** Серыял «Танец гарнастая».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Ёрк (ЗША). Дзень 7.
**08.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Ёрк (ЗША). Дзень 7.
**09.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 1.
**12.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Траса Нюрбургрынг (Германія). Заезд 2.
**13.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Траса Нюрбургрынг (Германія).
**14.15** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Ёрк (ЗША). Дзень 7.
**15.00** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 1.
**17.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Іспаніі. Этап 9.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/2 фіналу. Тамперэ (Фінляндыя).
**21.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 8.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Госць «Белсату».
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд».
**21.30** «Ад-магілы-да-магілы», маст. фільм.
**23.10** Аб'ектыў.

## 8 верасня, аўторак

---

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Ланцуг» (Расія).
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-3» (Расія).
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША).
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс».
**13.45** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Мары спраўджваюцца. Мінск-Вена». Відэафільм АТН.
**15.50** Авантурна-прыгодніцкі серыял «Каралі гульні» (Расія).
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-3» (Расія). Закл. серыя.
**18.45** Відэафільм АТН «Пастаўскія фарбы» цыклу «Зямля беларуская».
**19.35** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ланцуг» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.35** Баявік «Вікінг» (Расія). 2-я серыя.
**00.30** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Дэсантура». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Дэсантура». Шматсерыйны фільм.
**22.05** АНТ прадстаўляе: Міжнародны фэст феерверкаў «Навальніца». Дзень 1-ы. Канцэрт групы «J:Морс».
**23.35** Нашы навіны.
**23.50** Навіны спорту.
**23.55** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.20** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Мядовы месяц». Расія, 2004 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Насланне». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**15.35** «Рэтраманія».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Насланне». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**20.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**21.30** «Атрад». Серыял.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**23.05** «Аўтапанарама».
**23.30** «Надзвычайныя гісторыі».
**00.20** «Next 3». Серыял.

---

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Кінараман «Крах інжынера Гарына» (СССР). 1-я серыя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.25** Хакей. Формула гульні.
**11.50** Крымінальны баявік «Сын за бацьку».
**13.15** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**14.45** Бітва экстрасэнсаў.
**15.35** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**16.20** Пазакласная гадзіна.
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дакументальна-камедыйны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада).
**19.35** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Кінараман «Крах інжынера Гарына» (СССР). 2-я серыя.
**22.10** Камедыя «Яна ненавідзіць мяне».

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.05** «Апошняя гастроль Джо Дасэна». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.45** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі».
**13.25** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Самая прыгожая-2». Расія, 2008 г.
**15.10** Прэм'ера. «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі».
**22.30** Тэлесерыял «Самая прыгожая-2».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Прэм'ера. «Таямніца Ноева каўчэга».

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.10** Самыя гучныя «Рускія сенсацыі»: «Госці са зроку».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** Вострасюжэтны серыял «Мянтоўскія войны».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Мянтоўскія войны».
**22.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.20** «Вочная стаўка».
**00.10** Вострасюжэтны серыял «Танец гарнастая».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 8.
**08.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 8.
**09.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 2.
**12.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 8.
**15.00** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 2.
**17.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Іспаніі. Этап 10.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**18.55** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Дзень 9.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.40** МакраФон: Кружэлка (сусветная музыка).
**20.15** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**20.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма).
**21.35** «ГМА. Прагрэс ці катастрофа?», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**22.25** «Добрыя мясціны», дак. фільм, 2006 г., Германія.
**22.40** Аб'ектыў.

## 11 ВЕРАСНЯ, ПЯТНІЦА

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Ланцуг» (Расія).
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві» (Расія-Украіна).
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-4» (Расія). 2-я серыя.
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША).
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Веронiка Марс» (ЗША).
**13.45** «Шпілька».
**14.10** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Мары спраўджваюцца. Мінск-Прага».Відэафільм АТН.
**15.50** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-4» (Расія). 3-я серыя.
**19.30** «Смяротны транзіт». Відэафільм АТН.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ланцуг» (Расія). Заключная серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**23.30** Прыгодніцкі трылер «Здань і Цемра» (ЗША).
**01.30** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Дэсантура». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.10** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік». «Горад, паўсталы з попелу».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хвіліна славы». Новы сезон.
**22.45** Трылер «Трынаццаты паверх». ЗША, 1999 год.
**00.30** Фільм «Сёмы знак».
**02.05** Нашы навіны.
**02.20** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**09.40** «Гарачы лёд».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Насланне». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**15.35** «Атрад». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Насланне». Серыял. Закл. серыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**20.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Від зверху лепш». ЗША, 2003 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**23.05** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.50** Фільм «Псіхушка». ЗША, 2007 г.
**01.25** «Уцёкі». Серыял.

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Кінараман «Крах інжынера Гарына» (СССР). 4-я серыя, заключная.
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.20** Час футболу.
**10.50** Серыял «Каханне як каханне».
**11.55** Лірычная меладрама «Батанічны сад» («Беларусьфільм»).
**13.35** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).




**14.25** Бітва экстрасэнсаў.
**15.15** Мультфільм.
**15.35** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**16.15** Пазакласная гадзіна.
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Смачна з Барысам Бурдой.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне».
**19.05** Дак.фільм «Дарога да хаты» (Беларускае тэлебачанне).
**19.35** Усё аб бяспецы.
**20.10** Калыханка.
**20.25** Фантастычны баявік «Джоні Мнемонік» (Канада - ЗША).
**22.15** Псіхалагічная драма «Мне не балюча» (Расія).
**23.55** Гімнастыка спартыўная. Міжнародны турнір на прызы Віталя Шчэрбы.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Даярка з Хацапетаўкі». Расія, 2009 г.
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пакой смеху».
**15.10** Прэм'ера. «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгенія Петрасяна».
**22.30** Фільм «Забіць вечар».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Фільм «Сустрэнемся ля фантана».
**01.50** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Кухары і кухцікі».
**09.05** «Масква-Ялта-транзіт».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**11.30** «Галоўны герой» прадстаўляе: Рускія таямніцы Майкла Джэксана».
**12.10** Вострасюжэтны серыял «Мянтоўскія войны».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.05** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.50** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Мянтоўскія войны. Эпілог».
**22.50** Прэм'ера. Крымінальная драма «Гаспадары ночы».
**01.00** Фільм жахаў «Ад заходу да світанку».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**09.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 5.
**12.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**14.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Дзень 5.
**17.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Іспаніі. Этап 12.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**18.55** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**19.10** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**21.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**01.05** Ралі. Ралійная серыя IRC. Іспанія. Дзень 1.
**01.35** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**02.05** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**02.15** Футбол. Еўрагалы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў.
**19.10** «Дэтэрмінатар», серыял.
**19.55** «Днюка», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Курганы» (спазнаваўчая праграма).
**21.30** «Дазнанне», маст.фільм, 1982 г., Польшча.
**23.20** Аб'ектыў.

## 12 ВЕРАСНЯ, СУБОТА

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Скарбы сусветнай спадчыны» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.00** Здароўе.
**10.30** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Псіхалагічная драма «Дрэнны добры чалавек» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.30** «Смяротны транзіт». Відэафільм АТН.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Вакол планеты».
**16.15** «Зямля беларуская. Вытокі». Відэафільм АТН.
**16.40** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.45** Відэафільм АТН «Палескі раман» цыклу «Зямля беларуская».
**18.20** «Ваша лата».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Хор Турэцкага». Канцэрт.
**21.00** Панарама.
**21.40** Фантастычны баявік «Матрыца» (ЗША - Аўстралія).
**00.10** «Уласнай персонай».
**00.35** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Італіі. Кваліфікацыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?, 2005 год.
**09.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Вострaў памылак».Мультфільм.
**11.35** Фільм «Ідэальны муж».
**13.15** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** Прэм'ера. «Ірына Радніна. Непераможная».
**14.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва гарадоў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці. «Галоўная таямніца жыцця».
**16.50** «Старыя-разбойнікі».
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.45** «Ледніковы перыяд». Новы сезон.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд». Новы сезон. Працяг.
**22.25** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.05** Камедыя «Старыя клячы па-амерыканску».
**00.40** Трылер «Шантаж».

**06.45** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Фільм «Па сакрэце усяму свету». СССР, 1976г.
**09.35** «Ля парадната пад'езду».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**12.00** Фільм «Нашы суседзі». СССР, 1957г.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Салдаты. Залатыя серыі».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.30** Фільм «Павадыр». Беларусь, 2001г.
**19.00** «Рэпарцёр СТБ».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Жывы Журнал «Міс Мінск 2009».
**20.40** Фільм «Крапавы берэт». Беларусь, 2008г. 1-я і 2-я серыі.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** Фільм «Крапавы берэт». Беларусь, 2008г. 3-я і 4-я серыі.
**00.40** «Уцёкі». Серыял.

**07.30** Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**09.45** Жансавет.
**10.15** Сусветная анімацыя. «Конг: вяртанне ў джунглі» (Вялікабрытанія).
**11.35** Прыгодніцкі фільм «Па сакрэце ўсяму свету» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**13.45** Прэм'ера. Меладрама «Сурагатная маці-2» (Расія).
**15.55** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**18.20** «Дзень беларускага пісьменства. Смаргонь». Хранікальна- дакументальны відэафільм.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Тотэнхем - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**21.30** Камедыйная меладрама «Бляшаны кубак» (ЗША).
**23.55** Казанова.
**00.25** «Каралі Муай Тай». Міжнародны турнір па тайландскім боксе.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** Фільм «Сустрэнемся ля фантана».
**08.45** Мультфільмы.
**09.15** «Ранішняя пошта».
**09.50** «Легенды сусветнага кіно».
**10.20** «Суботнік».
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.15** Фільм «Забіць вечар».
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Каменская».



**15.20** «Формула ўлады».
**15.50** Фільм «Адпачынак у верасні». 1-я серыя.
**17.05** Фільм «Пацалунак матыля». Расія, 2006 г.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.40** Фільм «Таццяна». Расія, 2008 г.
**01.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.30** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Крымінальна-авантурная камедыя «Лёгкія грошы».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Алтар перамогі. Блакада».
**17.15** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма максімум».
**21.15** Прэм'ера. «Луі-кароль».
**22.30** «Ты не паверыш!».
**23.25** Баявік «Абуджэнне смерці».
**01.00** Прэм'ера. Крымінальная драма «Больш крута не бывае».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). 1/2 фіналу.
**11.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**14.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). 1/2 фіналу.
**17.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Іспаніі. Этап 13.
**18.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Іспанія. Дзень 2.
**19.15** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/2 фіналу.
**01.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**03.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** Аўтастопам праз Еўропу.
**19.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**20.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў Грунвальдскай бітве» (спазнаваўчая праграма).
**21.20** Суботні сеанс: «Першая сустрэчная», маст. фільм, 1998 г., ЗША.
**22.50** Аб'ектыў.

## 13 ВЕРАСНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.35** Дакументальна-пазнавальны серыял «Скарбы сусветнай спадчыны» (Францыя) . Заключныя серыі.
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 14.25** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.00** Культурныя людзі.
**10.35** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**11.25** «У свеце матораў».
**12.10** Лірычная драма «Восеньскі марафон» (СССР).



**13.55** «Nota bene».
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Італіі. Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.50** Суперлато.
**18.45** Рамантычная камедыя «Вялікае каханне» (Расія).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Футбол. Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.35** Камедыйная меладрама «Жаніх напракат» (ЗША).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** Мультфільм: «Карлсан вярнуўся».
**12.15** «Выведнікі. Апошні бой». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Уладзімір Співакоў. Без фраку».
**17.30** Прэм'ера. «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Летні кубак.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца». Новы сезон.
**22.05** Прэм'ера. «Паўднёвае Бутава».
**23.05** Прыгодніцкі фільм «Цягнік на Юму».
**01.05** Праграма Сяргея Шолохова «Ціхі дом» на Венецыянскім кінафэсце.

### СТВ

**06.30** «Праверана на сабе».
**07.15** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Від зверху лепш». ЗША, 2003г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Аўтапанарама».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.40** «Мінск, мая сталіца». Дакументальны фільм.
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Уваскрэсенне класікі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.15** «Аўтапанарама».
**17.45** Урачысты збор і святочны канцэрт да Дня горада.
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** «Міс Мінск 2009». Фінал.
**22.50** «Спартыўны тыдзень».
**23.10** Фільм «Брат ваяра». Францыя, 2002 г.
**01.15** «Уцёкі». Серыял.

### ЛАД

**08.05** Дабравест.
**08.30** Мір вашай хаце.
**08.40** Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША).
**10.15** Фільм-казка «Восеньскі падарунак фей» («Беларусьфільм»).



**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.10** Гаспадар.
**12.40** Прэм'ера. Іранічны дэтэктыў «Куля-дурніца-2». Агент для спадчынніцы» (Расія). 1-4-я заключная, серыі.
**15.55** Гандбол. Кубак ЕГФ. Мужчыны. СКА (Мінск) - Пыльва (Эстонія). Прамая трансляцыя.
**17.35** Пасоўванне+.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Днепр - Нафтан. Прамая трансляцыя.
**20.05** Дак. фільм «Гісторыя аднаго горада».
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.25** Іранічная камедыя «Красуні» (Францыя- Вялікабрытанія).
**23.50** «Правы чалавека».

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Фільм «Таццяна». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Гарадок.
**12.20** Фільм «Дым Айчыны».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлесерыял «Каменская».
**15.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**15.45** Фільм «Адпачынак у верасні». 2-я серыя.
**17.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**17.40** Прэм'ера. «Песні кіно». Канцэрт.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Фільм «Піцерскія вакацыі». Расія, 2009 г.
**23.30** Фільм «Восеньскі дэтэктыў».
**01.15** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць».
**11.20** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Аэрадром Крэмль».
**14.10** Музычная камедыя «Кампаньёны».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. «Крамлёўская кухня».
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.10** «Суперстар» прадстаўляе: група «Ласкавы май».
**23.15** «Авіятары».
**23.45** «Футбольная ноч».
**00.15** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.
**05.15** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. 1/2 фіналу.
**07.15** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.
**08.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Фінал.
**11.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.
**12.45** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ. Монца (Італія).
**13.30** Аўтагонкі. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Сільверстоўн (Вялікабрытанія).
**14.30** Снукер. Шанхай Мастэрс. Шанхай (Кітай). Фінал.
**17.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Іспаніі. Этап 14.
**18.45** Аўтагонкі. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Сільверстоўн (Вялікабрытанія).
**19.30** Мотаспартыўны часопіс.
**19.45** Лёгкая атлетыка. Фінал Гран-Пры ІААФ. Салонікі (Грэцыя).
**21.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Жанчыны. Фінал.
**23.30** Тэніс. Турнір Вялікага Шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Нью-Йорк (ЗША). Мужчыны. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**20.05** Форум (ток-шоу): «Чаму маладыя людзі эмігруюць?».
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** Акно ў Еўропу.
**22.00** Фільматэка майстроў: «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія, Іспанія, ЗША.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________
(по реестру ф. 11)
№ ____________
(по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.

(сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ЦІКАВА

# «УСХОДНЯЕ ПАРТНЁРСТВА» І МІЖЗЕМНАМОРСКІ САЮЗ

Алег НОВІКАЎ

**«Усходняе партнёрства» не нарадзілася на пустым месцы. Шмат у чым яно выкарыстоўвае напрацоўкі палітыкі ЕС у рэгіёне Міжземнамор'я, якую яшчэ называюць «Барселонскі працэс».**



У комплексе прычын цяперашняй актывізацыі рэгіянальных знешніх праграм ЕС на ўсходнім і на паўднёвым вектарах шмат як агульнага, так і адметнага.

Да агульнага можна аднесці, па-першае, геаграфічнае становішча краін, якія ўключаныя ў праграмы, і суадносна значную ролю гэтых рэгіёнаў для бяспекі Еўрапейскага кантынента. Па-другое, значнасць гэтых краін для эканамічнага развіцця і сацыяльнай стабільнасці ЕС перш за ўсё ў пытаннях міграцыі.

Менавіта магчымая дэстабілізацыя стала тым стымулам, які і абумовіў ініцыятыву і «Барселонскага працэсу» і праграмы «Усходняе партнёрства». У Міжземнамор'і ёсць свае кропкі напружанасці, у прыватнасці, спрэчкі Турцыі і Грэцыі вакол Кіпру, блізкаўсходні канфлікт, актывізацыя ісламскага экстрэмізму ў краінах Магрыбу. Сыход адсюль СССР стварыў своеасаблівы палітычны вакуум, і Еўропа мусіла яго запоўніць. Нарэшце, менавіта на пачатку 2000-х гадоў Еўропа пачала разглядаць сябе ў якасці глабальнага гульца, роўнага ЗША, але — гэта прынцыповая адметнасць — не ў супрацьстаянні, а ў цесным супрацоўніцтве з ЗША.

Другі адметны момант — разбежка па часе. Сваю агульную палітыку партнёрства з бліжэйшымі суседзямі па Міжземнамор'ю еўрапейцы пачалі праводзіць літаральна адразу пасля стварэння першых агульнаеўрапейскіх інстытутаў. Яшчэ ў Рымскай дамове, якая паклала пачатак інтэграцыі краін Еўропы, прысутнічаў блок канкрэтных мерапрыемстваў, прысвечаных праблеме Міжземнамор'я. Такім чынам, шмат з таго, што сёння задумваецца ў рамках «Усходняга партнёрства», было апрабавана ў іншым фармаце.

Звычайна на першых этапах актывізацыі кантактаў Еўрасаюз імкнецца падпісваць двухбаковыя дамовы з краінамі. З Турцыяй, Кіпрам і Мальтай былі нават заключаны дамовы пра асацыяцыі, што адкрывала перад імі патэнцыйную магчымасць далучэння да ЕС.

Уступленне патрабавала шмат часу, але дамоўленасці рабілі больш лёгкім выхад тавараў, выробленых у паўднёвых краінах, на еўрапейскія рынкі і такім чынам стымулявалі развіццё і мадэрнізацыю прамысловасці, спрыялі прытоку інвестыцый. І хаця адначасова ўводзіліся пэўныя абмежаванні на экспарт прадукцыі сельскай гаспадаркі, але за гэта краіны атрымлівалі эканамічную і фінансавую дапамогу.

**Дамоўленасці рабілі больш лёгкім выхад тавараў, выробленых у паўднёвых краінах, на еўрапейскія рынкі і такім чынам стымулявалі развіццё і мадэрнізацыю прамысловасці, спрыялі прытоку інвестыцый**

У акце, падпісаным у Маастрыхце, былі выкладзены новыя контуры адносін з краінамі Поўдня, якія вызначылі іх канкрэтную перспектыву стаць краінамі, асацыіраванымі з Еўрасаюзам. Увосень 1996 года ў Барселоне адбылася рэгіянальная канферэнцыя, якая прыняла Дэкларацыю аб «Міжземнаморскім партнёрстве». Яе падпісалі 27 дзяржаў. Партнёрства ставіла за мэту правядзенне «палітычнага дыялогу на рэгулярнай аснове, развіццё эканамічнага супрацоўніцтва і падтрымку сацыяльнага, культурнага і чалавечага развіцця». Менавіта на гэтым пасяджэнні была створана група па распрацоўцы праекта па фарміраванню ў Міжземнамор'і зоны свабоднага гандлю (запуск праекта плануецца на наступны год).

«Міжземнаморскае партнёрства» адразу намагалася працаваць як комплексная праграма. Рэгулярна адбываліся сустрэчы на ўзроўні міністэрстваў, былі створаны каардынуючыя і адукацыйныя цэнтры, наладжаны рэгулярны абмен інфармацыяй, праводзіліся мерапрыемствы ў галіне экалогіі, культуры і развіцця турызму.

Якасны крок быў зроблены ў мінулым годзе з падачы Францыі. Ніколя Саркозі ў якасці аднаго з пунктаў сваёй перадвыбарнай праграмы абвясціў стварэнне Міжземнаморскага саюза.

23 кастрычніка 2007 года ён жа, ужо як прэзідэнт Францыі, запрасіў усіх лідэраў краін Міжземнамор'я на саміт у Францыю, дзе і быў абвешчаны дакладны час стварэння саюза — чэрвень 2008 года, час пачатку старшынства Францыі ў Еўрасаюзе. Нарэшце 13 ліпеня ў Парыжы адбыўся саміт Міжземнаморскага саюза з удзелам прадстаўнікоў 43 краін. Прыняты статут і дэкларацыя.

У першапачатковых планах Міжземнаморскі саюз будзе кіравацца паводле прынцыпаў ратацыі (прынцып, падобны дзейнаму ў ЕС). Займаючыся пытаннямі энергіі і энерганосьбітаў, бяспекі, барацьбы з тэрорам, міграцыі, гандлю, Міжземнаморскі і Еўрапейскі саюзы змогуць працаваць разам у межах некаторых агульных структур, уключаючы праваахоўныя структуры ў рамках барацьбы з карупцыяй, тэрарызмам, арганізаванай злачыннасцю, гандлем людзьмі. Час падводзіць вынікі праекту саюза яшчэ рана, аднак перспектывы ў яго каласальныя (дастаткова згадаць пра ідэю Зоны вольнага гандлю).

Што тычыцца перашкод на шляху праекта, то сюды варта аднесці адсутнасць яснага бачання, як можна скасаваць сацыяльна-эканамічныя дыспрапорцыі паміж Поўначчу і Поўднем. Яшчэ адзін фактар — пазіцыя Турцыі, якая будучы кандыдатам у Еўрасаюз, баіцца, што ўдзел у Міжземнаморскім саюзе можа запаволіць працэс інтэграцыі ў ЕС. Не вельмі радасна ставіцца да саюза і Берлін. Ён вымушаны прызнаць ролю Францыі як пасярэдніка ў палітычным дыялогу з краінамі Міжземнамор'я і краінамі-пастаўшчыкамі афрыканскага прыроднага газу.

У гэтым плане праекту «Усходняга партнёрства» пашанцавала куды больш: ніводная з краін-удзельніц праграмы не знаходзіцца ў стане ўзаемнай канфрантацыі, а ўсе краіны ЕС, у сваю чаргу, дастаткова пазітыўна, без прыкмет рэўнасці, успрымаюць праект «Усходняга партнёрства». Аднак, каб дагнаць «міжземнаморцаў», «усходнім еўрапейцам» трэба будзе шмат папрацаваць.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

За ўсімі гэтымі поспехамі вытворчасці, буйнымі агракультурнымі комплексамі, дзе шараговы беларус наўрад ці можа сабе дазволіць адпачыць, заявамі пра «жаданне наладзіць супрацоўніцтва», губляецца чалавечы складнік суседняй краіны. Зразумела, што прэс-тур праходзіў у рамках падрыхтоўкі да беларуска-літоўскага эканамічнага форума, але занадта шмат было такога, што можа навесці на думку пра жаданне паказаць рэчаіснасць лепш, чым яна ёсць насамрэч.

**«DELVI» (Літва)**

Эксперты ў Мінску з недаверам ставяцца да абяцанняў урада Беларусі перайсці да рынкавай эканомікі. Так, напрыканцы мінулага тыдня Міністэрства гандлю абвясціла пра сваё бачанне. У адпаведнасці з рэкамендацыяй міністэрства, у крамах і на рынках павінна быць беларускіх тавараў 90 працэнтаў па харчовай і 70 працэнтаў па прамысловай групе. Нагадаем, што аналагічная норма існавала і раней, але ў свой час была адменена па патрабаванні расійскага боку. Думаецца, у дадзенай сітуацыі меркаванне саюзніцы Беларусь не турбуе. Нядаўняя сустрэча Лукашэнкі і Мядзведзева не ўнесла яснасці ў перспектывы расійска-беларускіх адносін. Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў яе туманна і мудрагеліста, сказаўшы: «Хуткім часам і ў эканоміцы, і ў палітыцы мы прымем такія прынцыповыя рашэнні, якія змогуць развязаць праблемы, якія ў нас сёння існуюць». Што да замежных інвестыцый, то пакуль урад дэманструе надзею на тое, што для іх прыцягнення не давядзецца «ламаць» адміністратыўна-камандную эканоміку.

**«Независимая газета» (Расія)**

Расійскі апазіцыйны палітык Уладзімір Рыжкоў лічыць, што перамовы двух прэзідэнтаў у Сочы, а таксама папярэднія і будучыя сустрэчы наўрад ці штосьці зменяць, бо «адносіны Расіі і Беларусі зайшлі ў тупік». Фактар гэтага палітык бачыць у тым, што Масква і Мінск па-рознаму ўяўляюць сабе фармат двухбаковых адносін і Саюзнай дзяржавы. Па словах Рыжкова, Крэмль канчатковай мэтай ставіць зліццё Расіі і Беларусі ў адзіную дзяржаву, у той час як Мінск глядзіць на рэчы дыяметральна процілегла. Акрамя таго, як растлумачыў былы першы намеснік старшыні Цэнтрабанка Расіі Сяргей Алексашанка, з-за скарачэнні прыбыткаў бюджэту і крызіснага стану расійскай эканомікі падтрымка, якую Расія аказвала Беларусі ў апошнія гады, будзе слабець.

**«Deuthe Welle» (Германія)**

Беларускія аналітыкі ўпэўнены, што пастанова № 1000 таксама не зможа абмежаваць імпарт. Прыняты дакумент адкрывае добрыя магчымасці для карупцыі: у ланцуг узгадненняў імпарту, паводле гэтага дакумента, уключаюцца службоўцы на месцах. Менавіта яны будуць вырашаць, каму даваць згоду на аперацыі па імпарце, а каму не. І менавіта яны будуць размяркоўваць валютныя ліміты на імпарт. Акрамя гэтага, па меркаванні эксперта, дакумент можа моцна ўскладніць адносіны беларускіх улад з Міжнародным валютным фондам. Менавіта таму ўлады і спрабавалі схаваць ад усіх гэтую пастанову.

**«Коммерсант» (Расія)**

Змена пазіцыі Лукашэнка па абмежаваным крузе ваенных пытанняў — следства «ўключэння мазгоў» пасля вельмі працяглага перыяду прыняцця рашэнняў у выніку «падсвядомых» пасылаў. Бацька разумее, што расійская ўлада гатовая абменьваць рэальныя матэрыяльныя выгоды на сімвалічныя каштоўнасці не бязмежна. Поўная адсутнасць у Масквы ўласнага цывілізацыйнага праекта ўскладняе эфектыўнае ўжыванне гэтых сімвалічных каштоўнасцяў. Як не верыў Лукашэнка ў перспектывы АДКБ і інш., так і не верыць. (А вось у Еўропы цяпер з'явіўся шанец значна пашырыць і ўмацаваць уласны цывілізацыйны праект, і Лукашэнка гэта добра «адчувае»). Вось калі Расійскі цывілізацыйны праект з'явіцца (а для гэтага патрэбна, каб амаль уся цяперашняя эліта «сышла з поля»), тады з'явіцца і палкае каханне замест шлюбу па разліку.

**«Комментарии» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ. НАЦЫСТЫ СУПРАЦЬ ТАРАНЦІНА



Выхад на экраны фільма Квенціна Таранціна «Ганебныя вырадкі» («Inglourious Basterds») пра групу амерыканскіх дэсантнікаў яўрэйскага паходжання, якія даюць прыкурыць нацыстам падчас другой сусветнай вайны, быў цікавы не толькі аматарам кіно і кіназнаўцам. Усе разумелі, што нямецкія правыя радыкалы, натуральна, пабачаць у стужцы «правакацыю супраць нямецкага народу» і будуць неяк рэагаваць. Пытанне — як? Яшчэ пару гадоў таму, калі Таранціна толькі абвясціў пра свой намер зняць карціну, «карычневыя» пачалі пісаць лісты пратэсту. У лютым у сеціве з'явіўся заклік да байкоту «прасіяніскай» карціны «рэжысёра псіха і наркамана». Аднак частка праціўнікаў Таранціна прапанавала ўсё ж наведаць кінатэатры і там распавядаць людзям праўду пра другую сусветную вайну. Хутка, аднак, аб'ектамі атак ультраправых стаў не Таранціна, а чыноўнікі з Мінкультуры, якія забаранілі прагляд карціны падлеткам, маладзейшым за 16 год.

**Па матэрыялах «Junge World» (Германія)**

### ВЕНЕСУЭЛА. ЛІДЭР ПА СЯМЕЙНАМУ ГВАЛТУ

Здаецца, дэмакратычная апазіцыя вырашыла біць па іміджу рэжыму Чавеса ў свеце з дапамогаю «жаночага пытання». У заходняй прэсе раздуваецца справа Аляксандры Ідальга, супрацоўніцы банку ў Каракасе. У маі 2004 года пасля працы на яе напалі мужчыны, сярод якіх знаходзіўся і яе былы муж. Жанчыну зацягнулі ў мікрааўтобус, дзе сем мужчын гвалцілі яе некалькі гадзін. На працягу апошніх пяці гадоў ахвяра дабіваецца, каб гвалтаўнікоў судзілі. Пракурор выдаў ордэр, аднак паліцыя нічога не робіць. У падобны справах лічыцца, што муж мае права згвалціць сваю жонку. Як піша газета «Diario Vea», кожны тыдзень па ўсёй краіне мужчыны забіваюць падчас сямейных канфліктаў пяць жанчын. Толькі 4 працэнты праяў сямейнага гвалту заканчваюцца судамі або скаргамі ў паліцыю. За апошні год у краіне гвалтоўна памерла больш за 14000 прадстаўніц слабага полу. Увогуле, падобная сітуацыя назіраецца па ўсёй Лацінскай Амерыцы. 40 працэнтаў усіх жанчын на кантыненце становяцца ахвярамі гвалтаўнікоў, аднак з Венесуэлай сітуацыя іншая. «Сацыялізм — гэта фемінізм», — кажа Уга Чавес. Аднак дынаміка росту згвалатванняў расце самымі буйнымі тэмпамі ў рэгіёне. Тое, што Чавес хацеў бы нешта змяніць, пра гэты факт сведчаць самі венесуэльскія феміністкі, аднак адміністратыўныя меры тут не працуюць. Апазіцыя кажа, што фактарам росту гвалту ёсць перш за ўсё стыль, якім Чавес кіруе краінай. Прэзідэнт адмаўляецца слухаць апанентаў і, як правіла, «па-мужчынску» проста ўжывае адміністратыўны гвалт.

**Па матэрыялах «New Stateman» (Вялікабрытанія)**



### КАЗАХСТАН. ГАРОДНІНА – ЗБРОЯ АПАЗІЦЫІ

Дзіўныя формы набывае апазіцыйная дзейнасць у аўтарытарных краінах былога СССР. Так, актывісты казахскай партыі «Азат» правялі пратэстную акцыю-выставу «Мова як орган і яе ўжыванне ва ўмовах сучаснага Казахстана». Мерапрыемства прысвяцілі асуджанаму журналісту Рамазану Есергепаву. Рамазан Есергепаў у жніўні быў асуджаны на 3 гады турмы і 2 гады абмежавання ў выдавецкай дзейнасці. Яго знайшлі вінаватым у незаконным набыцці службовай таямніцы Камітэта нацыянальнай бяспекі (КНБ) і друкаванні яе ў газеце. Праваабарончыя арганізацыі Казахстана і свету лічаць гэта парушэннем правоў чалавека. У якасці экспанатаў на выставе былі прадстаўлены розныя стравы з гародніны, садавіны і іншых прадуктаў. Напрыклад, дыня, у якой замест рота турэмная рашотка, інсталяцыя называлася «Самацэнзура». Гледачам асабліва спадабалася дыня, на якой высны — з бурака, морквы і таматаў. Дзіўна, але народу на выставу прыйшло вельмі шмат.

**Па матэрыялах «Азылык» (Казахстан)**

### ІЗРАІЛЬ. ЗМЕШАНЫЯ ШЛЮБЫ – ГАДЗІННІКАВАЯ МІНА

Той факт, што група, якая арганізавала выбух бомбы на пляжы Тэль-Барух 14 жніўня, складалася з юнакоў-арабаў і дзяўчат-яўрэек, папросту абурыла сяброў правых арганізацый Ізраілю. Яны згадалі даўнюю прапанову нябожчыка Мейра Кахана (равін і актывіст правых) забараніць шлюбы паміж арабамі і яўрэямі. У авангардзе цяперашняй фазы барацьбы выступае арганізацыя Yad L'Ahim (Братэрская бяспека). Яе лідэр звярнуўся да ўраду і парламенту з падобнымі ініцыятывамі. Галоўная праблема такіх шлюбаў, па яго меркаванню, незразумелая ідэнтыфікацыя дзяцей. Увогуле, яны быццам яўрэі, аднак па адукацыі і выхаванню часта вядуць сябе як арабы. Яшчэ далей пайшлі ў яўрэйскай калоніі Maaleh Adoumim. Там пачалі тлумачыць змешаным парам, што працяг кахання можа прывесці да выключэння са складу камуны. Аўтар ініцыятывы таксама прапанаваў запрацаваць паліцыю нораваў, якая будзе выкрываць «распуснікаў» сярод маладых яўрэяў, і нават запісаў сябе ў шэрагі такога фармавання. Паліцыя адразу папярэдзіла яго пра незаконнасць такой дзейнасці.

**Па матэрыялах «Courrier Internacional» (Францыя)**

ГРЫП

# СУСВЕТНЫ МОР

*Алег ПЯТРОЎ*

**«Масавы генацыд супраць чалавецтва, арганізатараў якога, на жаль, немагчыма асудзіць», — так пісаў вядомы амерыканскі вірусолаг Джэфры Тауфенберг пра наступствы эпідэміі так званай «іспанкі», якая пранеслася па планеце на пачатку мінулага стагоддзя.**





Ураджай смерці выглядае проста жудасна — 20 мільёнаў чалавек. І гэта толькі тыя, чые смерці афіцыйна зарэгістравалі. Зразумела, што ў Афрыцы і Азіі ніхто не складаў актаў смерці. Гэта дае падставу казаць нават пра 100 мільёнаў ахвяр. Некаторыя сцвярджаюць, што падчас піку эпідэміі кожны пяты чалавек на планеце хварэў на вірус.

На «іспанку» перахварэлі такія славутасці, як мультыплікатар Уолт Дысней, мастак Эдвард Мунк, іспанскі кароль Альфонс, амерыканскі прэзідэнт Франклін Рузвельт. Гэта пералік людзей, якія выжылі. А вось дачцэ Зігмунда Фрэйда і вядомаму французскаму паэту Апалінэру не так пашанцавала. Смерць ва ўсіх выпадках наступала ад удушша — следства распухання горла.

«Іспанку» адрознівала хуткасць, з якой яна рухалася і заражала людзей. Маладыя людзі ўставалі зранку абсалютна здаровыя, а ўвечары ўжо не жылі. Палова ахвяр эпідэміі — людзі ад 20 да 40 год.

Хаця іспанка паходзіць ад слова «Іспанія», іспанцы тут не пры чым. У лютым 1918 года Лорыг Мінер, аптэкар з мястэчка Хаскел Кантры, штат Канзас, не ведаў, радавацца яму або гараваць. Ягоная ўстанова перажывала залатыя часы — пацыенты ішлі і ішлі, папаўняючы касу. Літаральна штогадзіну аптэку наведвалі людзі з сімптомамі грыпу і прасілі лекі. Калі хворых стала занадта шмат, лекар вырашыў паведаміць мясцовым уладам і службе аховы здароўя ЗША.

Мінер напісаў, што ў штаце назіраецца эпідэмія, аднак цэнтральныя ўлады навіну праігнаравалі. Трывогу забілі пасля таго, як у лагеры для рэкрутаў, які мясціўся побач, за тры дні захварэлі 1100 чалавек, 38 памерла. Адначасова грып з'явіўся ў буйных гарадах. Магчыма, у іншы час хваробу можна было абмежаваць аднымі ЗША. Аднак ішла вайна. Фронт у Францыі патрабаваў штодня як мага больш амерыканскіх салдат. Так хвароба з'явілася на старым кантыненце.

У той час у краінах Антанты панавала вайсковая цэнзура. У журналістаў і думкі не было пра тое, каб пісаць пра масавую хваробу абаронцаў на перадавой. Затое пра яе маглі вольна пісаць газеты Іспаніі, якая захоўвала нейтралітэт. Напрыканцы мая 1918 года іспанская газета «Fabra» напісала пра эпідэмію невядомай хваробы, якая «нечакана пачынаецца, цягнецца нядоўга і забівае, знікаючы без следу». У выніку грып пачалі называць «іспанка».

Гучыць трохі дзіўна, аднак «іспанка» выратавала Францыю ад паразы. Калі Савецкая Расія падпісала з Германіяй сепаратны Брэсцкі мір, Германія пачала грандыёзную аперацыю: на заходні фронт з усходняга перакінулі мільён салдат. Рыхтаваўся штурм Парыжу. Адна надзея была на ЗША. Аднак саюзнікі не маглі прыбыць так хутка. Затое змагла «іспанка». Яна з'явілася на лініі Марны і за лічаныя дні парушыла ўсе планы немцаў. 37 дывізій ператварыліся ў кангламерат пакутуючых на насмарк. Дух перамогі знік. Пераможнага наступу так і не адбылося.

Праўда, не была эпідэмія літасцівай і да людзей па той бок траншэй. Кожны другі амерыканскі салдат памёр ад грыпу. У маі 1918 года ўрад Вялікабрытаніі прызнаў, што 10 тысяч маракоў англійскага флоту хворыя на грып.

Першая хваля «іспанкі» скончылася прыблізна ў пачатку лета 1918 года. Усе вырашылі, што пагроза прайшла. Вядомы брытанскі медычны часопіс «The Lancet» нават пачаў палеміку, ці была «іспанка» ўвогуле грыпам.

І тут пачалі прыходзіць жудасныя навіны з Афрыкі. Горад Фрытаўн, перавалачны пункт для брытанскіх войскаў, атакавала эпідэмія. Горад ахапіла масавая паніка. Людзі беглі хто куды. Падобныя весткі прыйшлі і з амерыканскага Бостана. Там знаходзілася вялікая група вайскоўцаў, гатовых да адпраўкі на фронт у Францыю. Аднак сваю смерць яны знайшлі на радзіме. Кожны трэці з 65 тысяч салдат трапіў у шпіталь.

І пачалося: хвароба пайшла гуляць па гарадах усходняга берага ЗША. Толькі ў Філадэльфіі ў адзін з кастрычніцкіх дзён 1918 года было зарэгістравана больш за 700 смерцяў ад грыпу. У Азіі маштабы эпідэміі былі яшчэ больш страшныя. Лічыцца, што ў Індыі ад яе загінуў 1 мільён чалавек. Адзін са сведак пісаў, што не хапала вугалю, каб паліць трупы. На некаторых астравах Ціхага Акіяну эпідэмія забіла да 22 працэнтаў насельніцтва.

Цяпер зразумела, што сітуацыя магла быць лепшай, калі б улады адразу пачалі ўжываць метады калектыўнай папярэдняй абароны, тыя ж марлевыя павязкі. Але доўгі час яны абмяжоўваліся плакатамі з надпісамі: «Калі баліць горла, сядзі дома». Пасля забаранілі натоўпы. У Нью-Йорку дайшло да канфузу. Тут існуе доўгая традыцыя калектыўных вулічных спеваў на каляды. 500 чалавек — аматараў спеваў — парушылі закон аб забароне збірацца на вуліцах і былі арыштаваныя.

Паколькі прычын грыпу ніхто не ведаў, людзі абараняліся хто як мог: нехта насіў амулеты з Нігерыі, нехта піў тытунёвую настойку або ваду, куды кідалі старонкі з сурамі з Карану.

Трэцяя хваля «іспанкі» пачалася ўвосень 1919 года і цягнулася да 1920-га. Пры гэтым тыя, хто ўжо хварэў на вірус, як аказалася, мелі імунітэт. Апошні раз сімптомы «іспанкі» заўважылі на пачатку 1930-х.

Трэба прызнаць, што дасюль няма ясных адказаў, у чым прычына такога мору. Магчыма, сцвярджаюць вучоныя, на той час людзі папросту не ведалі самых прымітыўных сродкаў абароны.

НАЦЫЯНАЛІЗМ

# ПЕРАМОГА НАД МАСКВОЙ

Іван БІЧ

**1 верасня ў Расіі быў не толькі Дзень ведаў, але і дзень праверкі лаяльнасці малых этнасаў да нацыянальна-культурнай палітыкі федэральнага цэнтру.**



Менавіта ў гэты дзень уступіла ў сілу пастанова Міністра адукацыі РФ № 300 пра рэгуляванне «нацыянальнага кампаненту» ў школьных праграмах, якая была прынятая яшчэ год таму. Адпаведна ёй, выпускныя іспыты ва ўсіх школах Расіі павінны здавацца выключна на рускай мове.

Статус моваў народаў нацыянальных аўтаномных рэспублік у выніку аўтаматычна паніжаўся. Фактычна іх вывучэнне пераходзіла ў факультатыўны фармат. Таксама Масква атрымлівала права ўстанаўліваць квоту на гадзіны выкладання такіх прадметаў, як мова, гісторыя і культура нацыянальных рэспублік. У цяперашніх школьных праграмах аўтаномных рэспублік падобныя прадметы займаюць у сярэднім 10–15 працэнтаў.

Гісторыя адносін цэнтру і акраін у сучаснай Расіі можна падзяліць на два этапы. У пачатку 1990-х рэгіёны, карыстаючыся анархіяй у Крамлі, актыўна гулялі ў нацыяналізм. Для мясцовых камуністычных эліт гэта часам быў адзіны сродак набыцця ў вачах народа легітымнасці.

Пасля з'яўлення Пуціна сітуацыя пачала мяняцца. Кульмінацыяй наступу цэнтру на правы рэгіёнаў сталі папраўкі ў канстытуцыю, якія пазбавілі рэгіёны права абіраць сабе кіраўнікоў. Цяпер прэзідэнтаў таго ж Татарстана, як і звычайных губернатараў, прызначае Крэмль. Нарэшце справа дайшла да нацыянальна-культурных правоў.

На словах маскоўскія чыноўнікі казалі, што задача рэформы — палепшыць шанцы вучняў школ з нацыянальнай мовай выкладання на паступленне ў ВНУ. Аднак у прыватных размовах яны не хавалі палітычнага кантэксту праекту. Так, будучы на семінары ў Казані, Вольга Арцёменка (кіраўнік Цэнтра нацыянальных пытанняў пры Мінадукацыі і навукі РФ) агітавала за змены, спасылаючыся на дадзеныя нейкага сацыялагічнага апытання. Адпаведна яму, у 82 выпадках са ста ў дзяцей школьнага ўзросту, якія жывуць у Татарстане, адсутнічае паняцце: «я жыву ў Расіі».

Менавіта Татарстан апынуўся на пярэднім фронце культурнай вайны за захаванне «нацыянальнага кампаненту». Гэтаму шмат прычын. Найперш, традыцыі самастойнасці ў мясцовых кіраўнікоў (напрыканцы 1960-х Казань прасіла ў Масквы статус саюзнай рэспублікі). Акрамя таго, у пачатку 1990-х Татарстан пасля Чачні быў самай мяцежнай правінцыяй. Дастаткова сказаць, што двойчы мясцовыя ўлады байкатавалі парламенцкія выбары ў цэнтральныя органы ўлады. У дамове 1994 года пра падзел паўнамоцтваў паміж Расійскай Федэрацыяй і Татарстанам апошні згадваецца як «суверэнная дзяржава — суб'ект міжнароднага права». Пэўны час Шаймііеў нават абсалютна сур'ёзна думаў пашырыць склад удзельнікаў Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі за кошт Татарстана. Праўда, як гаварылася вышэй, часы той вольніцы даўно мінулі.

Акрамя таго, апошні год у краі назіраецца сапраўдная актывізацыя нацыяналістаў. Як ні парадаксальна, аднак важным фактарам росту папулярнасці ідэяў самастойнага Татарстана стала перамога расійскай зброі на Каўказе ў жніўні 2008 года.

Пасля прызнання Расіяй незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі частка татарскіх грамадскіх арганізацый заявіла: «А чым мы горш?» І 20 снежня 2008 года на іх сходзе грамадскіх арганізацый быў прыняты ліст з патрабаваннем прызнання незалежнасці рэспублікі.

Спецслужбы адказалі на рухі сярод нацыяналістаў сіметрычна. Увесну былі распачатыя некалькі спраў супраць актывістаў нацыяналістычных груповак. Выданні, якія змяшчалі іх матэрыялы, атрымалі папярэджанні.

Самай экзатычнай была справа актывіста Татарскага грамадскага цэнтра (ТОЦ) Рафіса Кашапава. Ён выступіў супраць практыкі, якая існуе ў адным з радзільных дамоў у горадзе Набярэжныя Чалны. Там зранку па палатах ходзіць праваслаўны святар і праводзіць рытуал хрышчэння. Мусульманкі, якія ляжалі ў аддзяленні, паскардзіліся на гэта Кашапаву, а той напісаў гнеўны артыкул пад назвай «Прыпыніць хрысціянізацыю», які каштаваў яму паўтары гады ўмоўна.

Хаця казанскія ўлады ў прынцыпе падтрымалі заклікі нацыяналістаў байкатаваць у Татарстане пастанову аб нацыянальным кампаненце. Праўда, у менш радыкальным фармаце. Дзяржаўная прэса спрабавала не дражніць Маскву сепаратызмам. Шайміеўскія журналісты выступілі з канцэпцыяй шматпавярховай формулы расійскага нацыяналізму, на нізе якога любоў да малой радзімы, а на самым версе любоў да дзяржавы.

Паралельна, думаецца, Казань спрабавала ў кулуарах дамовіцца з Крамлём. Інакш бы развязка гэтай канфрантацыі была больш жорсткай і эмацыйнай. У нашым выпадку ўсё завяршылася палюбоўна.

На сустрэчы з педагогамі, якая звычайна праводзіцца ў Татарстане напярэдадні 1 верасня, прэзідэнт заявіў, што Масква перадумала. «Татарскія прапановы ўключаны ў выніковы праект па адукацыйных стандартах», — сказаў Шайміеў. Больш таго, калі верыць дакладчыку, межы выкарыстання татарскай мовы будуць яшчэ больш пашыраныя. Цяпер яе стануць выкладаць нават у дзіцячых садках. Праўда, абмовіўся лідэр татар, калі на гэта будзе воля Расіі». Гэты спіч татарская прэса трактавала як перамогу над Масквой. Старая адукацыйная сістэма ў Татарстане захаваецца, як мінімум, яшчэ на год.

Думаецца, што на самай справе перамога татар не канчатковая. Прынамсі праект па адукацыйных стандартах, пра якія казаў Шайміеў, ніхто пакуль у вочы не бачыў.

## Каментар

**Дзмітры Тарасаў, казанскі журналіст:**

— У нацыяналізм Шайміева слаба верыцца. Хіба не ён два гады таму згарнуў пад дыктатам федэральнага цэнтру пераклад татарскай мовы на лацінку. Раней ён таксама па патрабаванню Пуціна зачыніў усе турэцкія адукацыйныя цэнтры. Улады не жадаюць аддаваць апазіцыі такі моцны мабілізацыйны рэсурс, як нацыяналізм, а тым больш у часы эканамічнага крызісу. З іншага боку, саступка Масквы можа тлумачыцца напружанай сітуацыяй на Паўночным Каўказе. Адкрытая канфрантацыя з Казанню значыла б сістэмны крызіс усёй унутранай палітыкі апошняга дзесяцігоддзя. Прычым, магчыма, так яно сапраўды і ёсць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДЗМІТРЫЙ МЯДЗВЕДЗЕЎ



Прэзідэнт Расіі пасварыў будыстаў і праваслаўных. 25 жніўня бурацкія будысты прызналі прэзідэнта Расіі ўвасабленнем Белай багіні. Мясцовыя ламы, уражаныя візітам (Мядзведзяў — першы прэзідэнт РФ, які наведаў Бурацію), пастанавілі прызнаць яго ўвасабленнем аднаго з самых шанаваных багоў будыйскага пантэона — Белай Тары. Белая Тара малюецца звычайна ў выглядзе дзяўчыны, якая сядзіць у позе лотаса на троне з кветкай лотаса ў руцэ. У яе сем вачэй: пара звычайных, вока мудрасці ў ілбу, а таксама па воку на далонях і ступняў. Разглядзеўшы ў прэзідэнце дзяўчыну, будысты выказалі надзею, што гэта будзе спрыяць развіццю будызму ў Расіі. Аднак літаральна адразу рашэнне будыстаў выклікала неразуменне і абурэнне ў прадстаўнікоў Рускай Праваслаўнай Царквы. Ігумен Сяргей (Рыбко) заявіў прэсе: «Язычнікі паказалі сваю сутнасць — хітрую і крывадушную. Усё гэта не бескарысліва, зразумела… Жывых не прылічаюць да святых. Нават пасля смерці павінен прайсці нейкі час. Павінна быць у чалавека мноства заслуг, усё гэта вырашае Царкоўны Сабор. А ў іх лёгка і проста: прыехаў прэзідэнт, давайце яго назавем богам». Пакуль канфлікт развіваецца, і што будзе далей, незразумела.

### ІВАНА РАПКОВА



40-гадовы бургамістр чэшскага горада Хамутаў, сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі (ODS), стала самым пазнавальным палітыкам ва ўсёй краіне. Падставы для такога росту папулярнасці незвычайныя. Пані Рапкова праславілася рэпрэсіям супраць мясцовай цыганскай камуны. У лютым мэрыя дазволіла гвалтоўную канфіскацыю ў прадстаўнікоў катэгорыі «не інтэграваных грамадзян», большасць з якіх складаюць цыгане, грошай або матэрыяльных сродкаў у якасці штрафу за антысацыяльны лад жыцця. Справа выклікала нацыянальны скандал: шмат хто з ахвяр Рапковай апынуўся на мяжы беднасці. Міністр правоў чалавека назваў палітыку ўладаў Хамутава антычалавечай і падаў на іх у суд. Суд стаў на бок міністра, пастановы Рапковай адмянілі. Але яна не супакоілася: цяпер па Хамутаву ходзяць спецыяльны брыгады па барацьбе ўсё з тымі ж «антысацыяльнымі элементамі». Паслядоўная ксенафобская палітыка ператварыла яе ў самую пазнавальную асобу ў краіне і, натуральна, гарантуе папулярнасць. Івана Рапкова абавязкова трапіць у склад чарговага парламента (выбары адбудуцца ў кастрычніку). Застаецца дадаць, што наступствамі палітыкі Рапковай стаў уздым правага радыкалізму і канфлікт Прагі з Атавай. Даведзеныя да адчаю цыгане тысячамі беглі ў Канаду (паміж краінамі не было візавага рэжыму). Нарэшце ўвялі для чэхаў візы.

### МАРЫНА ДА СІЛВА ВАЗ ДЭ ЛІМА



Былы міністр аховы прыроды ў кабінеце прэзідэнта Лулы, якая з 1994 года была разам з ім сябрам Партыі працоўных, рэзка змяніла палітычную арыентацыю. Марына падала заяву ў Партыю зялёных. З дапамогай зялёных Марына збіраецца стаць першай жанчынай — прэзідэнтам Бразіліі. Выбары адбудуцца ў кастрычніку наступнага года. Спрыяльны фактар для Марыны — прэзідэнт Лула да Сілва, які захоўвае дастаткова вялікую папулярнасць, але не мае права больш балатавацца на пасаду прэзідэнта. Пры гэтым ён адмаўляецца ўносіць змены ў канстытуцыю, якія б маглі гэта дазволіць. Пакуль што галоўным яго спадкаемцам называюць былога левага тэрарыста, а зараз міністра юстыцыі Дзілму Русефа. Марына крытыкуе Русефа за тое, што ён не надае ўвагі развіццю альтэрнатыўнай энергетыкі. Аднак галоўнае — тое, што яна чарнаскурая, а гэта стварыла ёй імідж бразільскага Абамы (традыцыйна палітычная эліта Бразіліі складаецца з нашчадкаў еўрапейцаў). Апошняе, на думку аналітыкаў, дае Марыне нядрэнныя шанцы парушыць біпартыйную мадэль бразільскай палітычнай схемы: Партыя працоўных супраць Партыі сацыял-дэмакратаў.

НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# ПАРАНОІК

Марыя МАРТЫСЕВІЧ



**Хваробы бываюць розныя. Ёсць хваробы вечныя, кшталту грыпу. Ёсць хранічныя — кшталту самых распаўсюджаных сярод чалавецтва карыесу ці бранхіяльнай астмы. Ёсць гістарычныя хваробы — чума, халера, воспа. Ёсць хваробы гендэрныя — ПМС, узроставыя — старэчы маразм, ёсць генерацыйныя — астэахандроз, пошасць найноўшага кампутарнага пакалення. А бываюць хваробы нацыянальныя. Яшчэ нейкіх дваццаць год таму кожны беларус назубок ведаў някрасаўскія радкі пра беларускую нацыянальную хваробу каўтун, і найсвятлейшыя галовы краіны вострa і рашуча абураліся гэтаму імперскаму дыягназу. Але час мінае, гісторыя хваробы не стаіць на месцы. Ледзьве паспеўшы выблытацца з наканаванага ім каўтуна, напачатку XXI стагоддзя беларусы па вушы ўвязлі ў сімптомах новай агульнанацыянальнай хваробы, імя якой — паранойя. І першым, хто заўважыў, апісаў, канстатаваў новы агульны дыягназ, быў публіцыст Віктар Марціновіч.**

## Клініка

Я не памятаю, з якой менавіта нагоды і ў якім нумары «Белгазеты», намеснікам рэдактара якой ён з'яўляецца, Віктар Марціновіч словамі сфармуляваў тое, што насілася ў паветры з сакавіка 2006 года. Але я выдатна разумею, якія адчуванні змусілі аўтара здзейсніць гэта фармуляванне. Усе, хто жыў у Беларусі апошнія год 10, і асабліва знаходзіўся ў краіне на працягу тых месяцаў, калі адбывалася зачыстка ўсіх сфераў грамадства перад чарговым прэзідэнцкім тэрмінам, адчувалі тое ж. Зрэшты, тыя, хто не жыў, адчувалі таксама — дзякуючы інтэрнэту ў цэлым і сайту «Хартыя–97» у прыватнасці. Сегмент беларускага менталітэту «абы чаго не выйшла» быў так удала праэксплуатаваны напярэдадні выбараў ідэолагамі і спецслужбамі, што «не баяцца» стала неяк непатрыятычна. Недавер і асцярожнасць сталі не проста моднай мадэллю паводзін — стылем жыцця сацыяльна актыўнай праслойкі насельніцтва.

19 сакавіка 2006 года мы ўсе прачнуліся хворымі. Далейшыя падзеі толькі пагоршылі агульны стан арганізму. Нас расстрэльвалі з «снегавых гармат», трымалі на марозе, пужалі спецназам і снайперамі на дахах, родных і знаёмых, сяброў і калегаў саджалі і білі. Наўрад ці я калі-небудзь забуду элегантныя, спрактыкаваныя, гэткі ж натуральныя, як руканне ці падпальванне цыгарэты, — і ў той жа час шаманскі, наіўна-рытуальны жэст, з якім самыя розныя людзі, прыходзячы на важныя для іх перамовы, вышчоўквалі з мабільнікаў на стол батарэйкі. Лічылася, што гэта часткова ратуе ад праслухоўвання.

Паранаідальная боязь КДБ, даносаў і арыштаў, звальненняў з працы і гвалтоўнай эміграцыі — вось тое, што робіць сучасных беларусаў беларусамі, а не «цвяток радзімы васілька». 19 сакавіка 2006 года з трыбуны на прыступках ДК Прафсаюзаў у выкананні беларускіх паэтаў і бардаў гучала шмат барыкаднай лірыкі — пра васількі, Мову, а таксама Герб і Сцяг. І людзі на Плошчы ўспрымалі гэтыя вершы як асабістую абразу, як здраду нацыянальна-свядомай інтэлігенцыі свайму народу. Іх народ «пераадолеў страх», прыйшоў — а яны яму зноў — пра васількі, як дваццаць год таму, калі ўсе яшчэ з каўтунамі. 19 сакавіка 2006 года на прыступках ДК Прафсаюзаў прылюдна канала літаратура 1990-х. У натоўпе перад прыступкамі спаквала кшталтавалася літаратура 2000-х.

Я не лавіла яго рукой за кутас дарагога брэндавага шаліка, але я ведаю, што Віктар Марціновіч у тым натоўпе быў. Ведаю з сігналаў, якія ён час ад часу пакідае тым, што там былі таксама, у сваіх цынічных з выгляду публікацыях, праплочаных, што называецца, рукой Масквы. Узяць хаця б нарыс пра беларускую нацыянальную паранойю. Праз некаторы час пасля выхаду гэтага нарысу ў «Белгазеце» я даведалася, што ён быў не проста фельетонам на перадавіцу, а канцэпцыяй іншага — большага твору.

## Анамнез

Хваробы бываюць розныя. І амаль кожную з іх можна ператварыць у метафару. «Паранойя» — назва дэбютнага рамана Віктара Марціновіча, які ўвосень 2009 года выходзіць у Расіі.

Калі спытацца старэйшых калегаў, хто такі Віктар Марціновіч, іх рэакцыя будзе адназначнай: вундэркінд-беларусафоб. І сапраўды — мой герой у сур'ёзнай журналістыцы больш за дзесятак год (з, лічы, падлеткавага веку), прычым палітаглядальнікам з трывалым непрыняццем пэўнага ідэалагічнага гатунку беларусаў, а менавіта «адраджэнцаў». Зрабіўшы сабе імя яшчэ ў легендарнай газеце «Імя», ён і па сённяшні дзень ударна працуе ў рускамоўнай прэсе Беларусі. У свае 32 гады, ён выкладчык мастацтвазнаўства ЕГУ са ступенню PhD (дысертацыя пра віцебскую мастацкую школу) і без перабольшанняў культавы журналіст, ікона слова для беларускай багемнай буржуазіі, сярэдняга класа, што акурат перажывае пакуты нараджэння, перакшталтоўваецца з постсавецкай інтэлігенцкай праслойкі ў альтэрнатыўную, можна нават сказаць, падпольную эліту. Не пабаюся гэтага слова з варожага яму лексікону, Марціновіч — пясняр гэтага класу, з яго катэджамі ў Раўбічах і выкупленымі ў сялян хутарамі над Віліяй, з кавай у Вільні і раством у Парыжы. Чаго, якога гемарою ці іншай хваробы не хапала для поўнага шчасця гэтаму рэальнаму чуваку? Гэтаму рэальнаму чуваку закарцела зрабіцца пісьменнікам. І не проста пісьменнікам, а менавіта — насуперак усім фобіям, якія яму прыпісваюць, — беларускім.

Беларускі літаратурны дыскурс сваёй аэрадынамікай нагадвае яйка. І не простае, а залатое. Чакаецца, што з дня на дзень з гэтага яйка вылупіцца нешта вялікае, нейкае Новае Слова, доўгачаканы беларускі Нобелеўскі лаўрэат ці наўпрост — новы Уладзімір Караткевіч. Прабіць бліскучае шкарлупінне звонку камусьці, хто піша ў Беларусі і пра Беларусь, але на рускай мове, не прадстаўляецца магчымым. Вялікія і магутныя Веньямін Блажэнны і Кім Хадзееў асабліва не білі, і таму не прабілі. Белыя і пушыстыя Майкл Галдзянкоў і Тома Лісіцкая білі-білі — не прабілі. Жахлівыя камерцыйныя Вольга Грамыка і Анатоль Жвалеўскі білі-білі — не прабілі... Не хочацца сурочыць, але, здаецца, кампутарная мышка Віктара Марціновіча ўжо махнула хвастком.

## Дыягназ

Дзеянні рамана «Паранойя» адбываюцца ў сучасным Мінску — сталіцы Беларусі. Ціхі, прыгожы і з выгляду еўрапейскі горад жыве падвойным жыццём. За вонкавай стабільнасцю ў кожнай шчыліне затаіўся страх. Краінай кіруе Мікалай Мураўёў — галава Міністэрства дзяржаўнай бяспекі, міністр, які прызначае прэзідэнтаў. У гэтай гнятлівай атмасферы зараджаецца каханне галоўных герояў. «Паранойя» — мілосная гісторыя, пераказаная чытачу ў форме пратаколаў праслушкі МДБ.

Дамову з расійскім выдавецтвам Марціновіч падпісаў з тых меркаванняў, што яму, чалавеку ўскрай занятаму, не давядзецца займацца рэкламай і дыстрыбуцыяй кніжкі самастойна. Але тут выявілася галоўная неспадзяванка. Расійскія рэдактары прапанавалі пісьменніку перапісаць раман, выкрасліўшы з яго любыя згадкі пра Беларусь. Так, каб і ў Саратаве, і ў Кемерава тэкст здаваўся родным, прыветным... Выявілася, што праз падобную працэдуру правак праходзіць уся рускамоўная беларуская літаратура, якая выдаецца ў Расіі. І Магілёў ператвараецца ў «адзін абласны горад», а Мінск — у Маскву. І тут Марціновіч нечакана, быць можа, і для самога сябе, праявіў характар — проста як лётчык, якому хочуць ампутаваць не такую ўжо і безнадзейную нагу. Вынікам змагання стала тое, што ў Расіі без усялякіх камерцыйных падгонак і экуменічных купюраў выходзіць раман пра сучасную Беларусь.

## Тэрапія

Калі радзіма расколваецца напалам, расколіна праходзіць па сэрцы паэта, сказаў Гётэ. Калі радзіма хварэе, празаік робіць сабе прышчэпку таго ж вірусу. Віктар Марціновіч доўга і руплiва збіраў фактуру і настроі для свайго рамана. Гутарыў з людзьмі, што праходзілі праз КДБ, ды з супрацоўнікамі органаў і, галоўнае, разам з усімі моцна, зацята, клінічна баяўся. «Паранойя» — твор аўтабіяграфічны, але гэта аўтабіяграфізм вышэйшага парадку: аўтабіяграфізм эмоцый і менталітэту. Галоўны герой — празаік Анатоль Нявінскі — мне здаецца, значна больш сам аўтар, чым гэта звычайна бывае ў пісьменніку. Найперш таму, што вельмі баіцца. І пастаянна сумняваецца. І шукае, дапытваецца чагосьці.

Настаўніца беларускай мовы вучыла нас, як гэта дыктавалася ёй школьнай праграмай, любіць Беларусь без ценю сумневаў і адданa, але калі нехта круціўся на месцы ці размаўляў падчас уроку, пераходзіла на крык, ужываючы пры гэтым чысцюткую рускую мову. Настаўніца рускай мовы таксама вучыла нас любіць Беларусь. А яшчэ свабоду. А яшчэ яна сказала перад выпускным, што галоўная рыса інтэлігентнага чалавека — сумнявацца, не лічыць сябе ісцінай у апошняй інстанцыі. Аўтар жорсткай і крытычнай публіцыстыкі пра беларускую рэчаіснасць Віктар Марціновіч — менавіта такі постсавецкі інтэлігент, поўны ўнутраных сумневаў і няпэўнасці — усе гэтыя паняверкі кранальна праступаюць між радкоў у тэксце «Паранойі».

Не здзіўляйцеся, што я пішу пра гэты раман задоўга да афіцыйнага выхаду. Скончыўшы твор, Марціновіч разаслаў яго неверагоднай колькасці людзей, пытаючыся, ці варта друкаваць, ці не паправіць нешта. І мы ўсім мірам раілі, папраўлялі... Адзінае, у чым да канца перакананы Марціновіч, — гэта ў тым, што ён беларус. Проста ён ніколі ня перакшталтуецца ў таго паўвясковага, безапеляцыйнага змагара, які стане сваім у айчынным апазіцыйна-культурніцкім бамондзе. У яго проста не атрымаецца — зірніце, з якім апломбам ён сядзіць за столікам снобскага «News Cafe» на вуліцы Карла Маркса. Дарэчы, у яго рамане з гэтага месца ўсё і пачалося.

**P.S.:**

— Што гэта за артыкулы ты пішаш? — маці выйшла мне насустрач з нумарам «Новага часу», дзе быў анансаваны гэты мой нарыс. — Хіба можна так пра самога Марціновіча? Ён жа пакрыўдзіцца!

Віктар Марціновіч — кумір маёй сям'і, персона недатыкальная, радкі, падпісаныя яго імем, — святыя. Панядзелкавую «Белгазету» з новымі дыягназамі, пастаўленымі беларускаму грамадству, чакаюць у доме, як пачатку ацяплялльнага сезону ўвосень.

— Я думаю, ён зразумее, — адказала я.

— Не, усё ясна, кідкі загаловак, скандал — але табе гэта навошта? Ну што ў цябе за прафесія? Журналістаў вечна па судах цягаюць, садзяць, забіваюць нават. І не глядзяць, што жанчына. Асабліва — тут яна інстынктыўна азірнулася па баках, — у такой краіне, як наша. Не пішы болей!

— А што мне яшчэ рабіць? Я больш нічога не ўмею.

— Не крыўдуй, проста ты мая дачка, і часам як напішаш нешта — то як зашчыміць сэрца, нешта такое трывожнае як засядзе ўнутры... Як жа гэты стан называецца?..

— Паранойя, — падказаў бацька, не адрываючыся ад розыгрышу «Суперлато».

З НЕВЯДОМАГА

# КРЭСКІ ДА ПАРТРЭТА МАСТАЧКІ СА СЛОНІМА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Дырэктар Луўра мес’е Анрэ Луарэат у пераліку перспектыўных накірункаў супрацоўніцтва з Нацыянальным мастацкім музеем Беларусі выказаў цікаўнасць да творчасці беларускага мастака XIX стагоддзя Івана Хруцкага, двухсотгадовы юбілей з дня нараджэння якога будзе адзначацца ў 2010 годзе як памятная дата ЮНЕСКА. У святочна-прэзентабельную экспазіцыю, што будзе наладжана супольна з літоўскімі калегамі, наўрад ці ўвойдуць творы мастака з музеяў Кракава і Варшавы, з Акруговага музея ў Беластоку. А таксама творы слонімскай мастачкі Клаўдзіі Хруцкай.**

## Час абнадзейваў

Клаўдзія паходзіла з роду Бенбноўскіх (Ксаверый Бенбноўскі — капітан паўстанцкай арміі Тадэвуша Касцюшкі). Іх маёнтак знаходзіўся побач з радавым гняздом Хруцкіх — Захарнічамі (на Полаччыне). Мастацкую адукацыю яна атрымала ў ахопленай полымем рэвалюцыі і братазабойчай вайны Расіі. Па ўтаймаванні крывавых ваенна-рэвалюцыйных падзеяў яна пабралася шлюбам з суседам, Іванам Хруцкім, унукам знакамітага мастака. І ў 1923 годзе ў іх нарадзілася дачка Ганна.

Час абнадзейваў: насуперак катастрафічным наступствам сацыяльнай буры спакваля ўсталёўвалася мірнае жыццё. У 1924 годзе да Беларусі была далучана Віцебская губерня, распачата Дзяржаўная праграма беларусізацыі, ішло станаўленне нацыянальнай школы, набіраў моц краязнаўчы рух. З’яўляліся новыя часопісы, нараджаліся навуковыя і грамадскія суполкі ды таварыствы. Запачаткоўваліся новыя калекцыі і музеі. Беларуская мова станавілася «моднай» і ў чыноўніцтва.

Гэтыя зрухі не маглі абмінуць (ці хоць бы закрануць) маладую сям’ю Хруцкіх, чые продкі, кожны па-свойму, сцвярджалі «самасць» беларускай зямлі і яе народа. Іван ды Клаўдзія, відаць, са спадзевам ставіліся да нацыянальнага вызначэння краіны. Але прыйшлася сталася больш шматгранна, не аднасэнсоўнай і, на жаль, трагічней за тое, што мроілася. Бог літасцівы не даў параніць сэрцы відовішчам, як у 1930 годзе ўсіх, хто яшчэ жыў у Захарнічах, выслалі ў Котлас, дом забілі дошкамі, а карціны,



Сяргей Хмара.
Фота з карціны Клаўдзіі Хруцкай



Анатоль Іверс.
Фота з карціны Клаўдзіі Хруцкай

кнігі, раяль і іншую маёмасць некуды вывезлі.

## Напярэдадні

Невядома, чаму сям’я Хруцкіх перабралася менавіта ў старасвецкі Слонім, над якім лунаў дух-ахоўнік канцлера ВКЛ Сапегі і гучала рэха паланеза князя Агінскага, а мо не страціліся спадзяванні на абяцанні маршала або былі прывязкі асабістага характару, на адраджэнне грэка-каталіцкай місіі ў Альберціне ў 1924 годзе. Так ці інакш, засталіся яны на роднай зямлі, а не апынуліся дзесьці ў Цэнтральнай Польшчы.

У Слоніме Клаўдзія настаўнічала, займалася сям’ёй, малявала.

Па нядзелях сям’я выпраўлялася да касцёлу бернардзінак на імшу, якую правіў па-польску (па-беларуску было забаронена) ксёндз Адам Станкевіч.

«Пры Польшчы яна выкладала беларускую мову ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі... Думаю, што дзякуючы Хруцкай бібліятэка семінарыі займела, як на той час, багаты беларускі збор, з якога я шчодра браў веды, калі стаў свядомым беларусам» (З ліста Барыса Данілюка да журналіста і краязнаўцы Сяргея Чыгрына).

Хоць і не мела Клаўдзія Хруцкая дачынення да ВУСБ, яе імя раз-пораз мільгала ў тагачаснай перыёдыцы і іншых матэрыялах. Да прыкладу, у сярэдзіне мая 1933 года ў Вільні была адчынена гадавая справаздачная выстава Таварыства Незалежных мастакоў і скульптараў. У традыцыйным фэсце мастацтва, апрача дзейных сябраў аб’яднання, бралі ўдзел госці з Кракава, Львова, Варшавы ды мастакі з падвіленскіх і не толькі ваколіцаў, якія прэтэндавалі на сяброўства ў таварыстве. У той год пані з вуліцы Панятоўскага, Клаўдзія Хруцкая, у Каталозе выставы, які зберагаецца ў Фондзе рэдкай кнігі Бібліятэкі АН Літоўскай Рэспублікі, была азначана ў якасці кандыдата. У 1935 годзе яна фігуруе ўжо як паўнавартасны сябра.

Не пакідала яна сваю мастацкую дзялянку ні за палякамі, ні з прыходам вызваліцеляў, ні пазней.

## Пад чорным крысом

Падасца парадаксальным, але дадатковы штуршок да развіцця мастацтва ў Заходняй Беларусі дала акупацыя. Беларусам — нацыянальнай большасці — ва ўмовах Краю пад Польскай юрысдыкцыяй, займацца мастацтвам (атрымоўваць адукацыю, працаваць творча і незалежна і г.д.) было хоць і мажліва, але значна больш складана, чым прадстаўнікам патранатнай нацыі. Сітуацыя змянілася ад лета 1941 года. Акупацыйныя ўлады, заігрываючы, а здаралася, і па недаглядзе, калі не спрыялі, дык ва ўсялякім разе не перашкаджалі творчай самарэалізацыі народа. Беларус жа, зняможаны франтамі, акупацыямі, рэквізіцыямі, маючы на розуме прымаўку: «Дай Божа, каб Гітлер Сталіна разбіў, а Гітлера Пярун спаліў», не толькі выжываў, але і ствараў. Стоеная энергія вырывалася вонкі.

Працавалі выдавецтвы, сустракалі сваіх гасцей абноўленыя музейныя экспазіцыі, адчыняліся беларускія пачатковыя і сярэднетэхнічныя школы і настаўніцкія семінарыі. Прыкладаліся намаганні да адкрыцця мастацкіх навучальных установаў у Баранавічах (куратар А. Шымановіч), Слоніме (куратар С. Грудкоўскі). Навучанне ратавала ад прымусовых прац у Германіі, але ініцыятывы гэтыя не былі рэалізаваныя ў поўным фармаце.

Мастакоўскае кола прафесіяналаў і аматараў у Слоніме разам з некалькімі бежанцамі са Смаленшчыны налічвала 15 чалавек. Творчасць большасці з іх тым ці іншым чынам была прадстаўлена ў экспазіцыі мясцовага музея, у тым ліку і працы Клаўдзіі Хруцкай (партрэты Н. Арсенневай, С. Хмары — пастэль).

Агульнагарадская выстава адчынілася 5 сакавіка 1944 года з ініцыятывы Слонімскага аддзела Беларускага культурнага згуртавання. У ёй удзельнічалі: К. Хруцкая, А. Бенікаў, С. Грудкоўскі, Любанскі, В. Калюцік-Сташэўская, Н. Жыткевіч, Паўленка, Ф. Засадскі і 13-гадовы мастак В. Філіповіч. За пару першых дзён яе наведала больш за 1000 чалавек. 25 сакавіка 1944 года. «Слонімская газета» (№ 17) надрукавала вялікі агляд выставы, больш за палову якога было прысвечана Клаўдзіі Хруцкай.



Фота myslonim.narod.ru

Чэрвень 1941. Танк спыніўся у канале Агінскага

## Партрэтны жанр

Клаўдзія Хруцкая — перадусім майстар партрэтнага жанру. Апрача знешняга падабенства, партрэт вымагае раскрыцця характару асобы, вызначэння індывідуальнага жыцця шляхам унутранага сузірання і маўклівага дыялогу мастака і мадэлі. Усё ў тым жа аглядзе выставы «Слонімская газета» піша: «Добрае ўражанне робіць партрэт дачкі з косамі. Адчуваецца ў ім мацярынскае цяпло, ёсць і той вонкавы эстэтызм, які сустракаецца на партрэтах «добрых старых часоў» мастацтва і такі рэдкі ў наш час грубай неразборлівасці рэалізму... Хочацца адзначыць асобна партрэт «Чырвоны каптурок» (таксама партрэт дачкі). Колькі ж у ім добрай артыстычнай эфектоўнасці, маладой жыццесцвярджальнасці, якое маляўнічае багацце тонаў ды эфектных рэфлексаў у гэтай невялічкай сімфоніі чырвані і маладога твару».

«Партрэт Наталлі Арсенневай», што экспанаваўся ў складзе выставы, і месца захавання якога зараз невядома, быў вельмі станоўча адзначаны рэцэнзентам-сучаснікам. Сп. Клаўдзія ведала і адчувала творы Арсенневай, сустракалася з летуценна-трагічнай паэткай, калі спадарыня Наталля прыязджала ў Слонім (разам з трупай мінскага тэатра). Мяркуем, што калярова-каларыстычная гама партрэта была блізкай слоўнаму жывапісу Арсенневай.

Жорсткая схема пастаноўкі мадэлі (франтальны, пагрудны, нібы пратакольнае фота) у партрэце паэта Сяргея Хмары перадвызначае яго змест, адкрывае прамы (мо залішне) і бескампрамісны характар паэта-змагара, які свой першы паэтычны зборнік «Жураўлiным шляхам» выдаў у перадваеннай Вільні 1939 года. Хмара паспытаў вязніцаў пры ўсіх уладах, пад акупацыяй працаваў на радыё, а ў паваенныя часы апынуўся на эміграцыі. Партрэт яго падаецца ўдалым (хоць сучаснік-крытык меў іншае меркаванне).

Іншы характар і, адпаведна, іншы падыход у мастачкі да выявы паэта Анатоля Іверса (Івана Міско). Рэцэнзент не адзначыў гэты бліскучы твор, бо на выставе яго не было. Гнаны з усіх гімназіяў: з Віленскай (1928), Клецкай (1929) і Навагрaдскай (1931) за грамадскую і нацыянальную чыннасць, не праміну́ўшы турмы ўсіх уладаў, паэт да адкрыцця выставы сышоў у лес да партызанаў. Паводле ўспамінаў Івана Дарафеевіча, з ім у сп. Хруцкай былі больш шчыльныя стасункі, чымсьці з іншымі. Пад акупацыяй антыфашыстпадпольшчык Анатоль Іверс працаваў у агульным аддзеле гарадской управы, а муж Клаўдзіі Хруцкай, унук славутага мастака Іван — там жа бухгалтарам. Мелі яны агульныя смяротна небяспечныя справы.

Рызыкоўным і абачліва-думным адначасова, з засяроджана пільным поглядам карых вачэй паўстае малады і гожы паэт у нібыта прахадным партрэціку сп. Клаўдзіі. Але, мабыць, былі (і недзе ёсць) іншыя партрэты. Ды і не толькі.

Удзельнічала Клаўдзія Хруцкая і ў другой гарадской выставе сямі слонімскіх мастакоў, вернісаж якой адбыўся 14 мая 1944 года. Але набліжаўся фронт. Сям’ю Хруцкіх немцы адправілі на прымусовую працу ў Судэты.

* * *

Клаўдзія Хруцкая з роду Бенбноўскіх рэпрэзентавала Беларусь нізкай вобразаў герояў новых часоў — прадстаўнікоў свядомай беларускай інтэлігенцыі.

Наколькі аб’ёмнай і паслядоўнай была гэтая праца, што засталася па-за межамі выставаў і аглядаў рэцэнзентаў, мажліва паспрабаваць спраўдзіць праз асабістыя архівы мастачкі, што захоўваюцца ва ўнукаў у Варшаве.

## ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# ВЁСКА ВЫМІРАЕ

**Не так даўно давялося мне наведаць шэраг невялікіх вёсак Бялыніцкага раёна, бо прайшоў год з дня смерці жончынай бабулі і патрэбна было запрасіць радню на жалобны стол. Не наведваў іх некалькі гадоў, для гэтага не было ніякай патрэбы, дый часу вольнага. Але калі я пабачыў, што ж адбываецца з невялікімі вёскамі, у мяне быў сапраўдны шок.**



Photo.ByMedia.Net

Гэтых вёсак ужо практычна няма. У кожнай з іх дажываюць свой век па некалькі састарэлых людзей, калі-нікалі са сваімі сталага ўзросту, не вельмі путнымі, дзецьмі. У некаторыя з вёсачак на лета прыехалі ў бацькоўскія хаты дачнікі, некаторыя стаяць наогул пустымі. Да былых сядзіб з усіх бакоў падступае лес, нідзе не чуваць дзіцячых галасоў. Для састарэлых жыхароў самая важкая падзея ў жыцці — гэта прыезд аўталаўкі, гандлярка якой не толькі прадасць неабходныя тавары, але і распавядзе пра тое, што адбываецца ў свеце. Шмат у каго са старых няма тэлевізара, а калі ж зламаецца радыё... Дваццаць першае стагоддзе на двары...

Асабліва моцнае ўражанне пакінула вёска Барсукі Запольскага сельсавета, дзе стаяць сем цалкам пустых хат і не відаць ні аднаго жывога чалавека. Іх тут папросту не засталося. Хто памёр, каго забралі дзеці. Дарэчы, яшчэ зусім нядаўна хат было восем, але адна згарэла — падпаліў якісь выпадковы грыбнік ці ягаднік. Добра, што зарыва заўважылі жыхары суседніх вёсачак (у якіх таксама пражывае ўсяго па некалькі чалавек), патэлефанавалі ў аддзел МНС, пажарнікі затушылі папялішча і не далі распаўсюдзіцца агню. А гэта ж вёска вядомая паводле пісьмовых крыніц з XIX стагоддзя, у 1897 годзе ва ўрочышчы Барсукі было 17 двароў і 112 жыхароў. Ды яшчэ ў 2007 годзе ў вёсцы налічвалася 9 гаспадарак і 11 жыхароў.

Цалкам пустымі стаяць былы пасёлак Жорнаўка Цяхцінскага, вёска Студзёнка Запольскага сельсаветаў, дажываюць свой век апошнія жыхары ў Дуброве, Старыне, Скавародцы, Паліўніках, Парахоўцы, Малатоўках, Мазках, Курганні, Гуце, Ігліцы...

Не трэба быць прарокам, каб зразумець, што ў бліжэйшы час сітуацыя з малымі вёскамі ў Бялыніцкім раёне будзе толькі пагаршацца, і ў хуткім часе яны сыдуць у нябыт разам са сваімі апошнімі жыхарамі. Таксама зразумела, што колькасць выміраючых вёсак у нашым раёне, як і ў краіне ў цэлым, будзе толькі павялічвацца. Дзяржава узяла курс на ўзбуйненне сельскагаспадарчай вытворчасці, усё працаздольнае насельніцтва канцэнтруецца ў аграгарадках, на цэнтральных сядзібах гаспадарак. А гаспадарак гэтых у нас у раёне з кожным годам усё менш.

Мае асабістыя назіранні паказваюць, што як толькі з вёскі знікае вытворчая дзейнасць, зачыняецца школа, крама — жыццё ў гэтай вёсцы пачынае паступова затухаць. Мне ўжо зараз сумна глядзець на некаторыя былыя цэнтральныя сядзібы гаспадарак Бялыніцкага раёна — жыццё ў іх замірае, рэзка памяншаецца колькасць працаздольнага насельніцтва і дзяцей. А што будзе яшчэ праз некалькі год?

**Барыс Вырвіч, Бялынічы**

## ЭСЭ

# ПАД МОСТАМ

**Тамаш ПАЛЬМАЧЫНСКІ**

**Афіцыйная прапаганда любіць змяшчаць Беларусь у цэнтр Еўропы, надаючы гэтаму асаблівы ўрачысты сэнс. Маўляў, хіба можна такую прагрэсіўную краіну ў самым цэнтры кантынента павучаць, настаўляць і высоўваць ёй ультыматумы?**




І на самай справе, давайце ўзгадаем курс сярэдняй школы: геаграфічная Еўропа палягае паміж Атлантыкай і Уралам. А гэта значыць, што і варкуцінскія канцлагеры, і пермскія катаржныя кавальні — усё гэта раўнапраўныя з Луўрам і Біг Бэнам кантынентальныя суб'екты. Само сабой, што ў такім кантэксце і ў параўнанні з якой-небудзь Валагодскай цэнтральнай перасылкай Беларусь выглядае бліскучай імянінніцай і круглай выдатніцай.

Між тым, рэальная Еўропа амаль што вызначылася са сваімі межамі, пакідаючы Беларусь звонку за высокім плотам у зоне халернага санітарнага барака на мяжы з фактычнай Азіяй. Гэта вельмі абурае некаторых важных палітыкаў у Мінску. Як гэта, наракаюць яны, мы ж — мост паміж Захадам і Усходам. А Усход — справа тонкая, не ўсе разумеюць ягоныя тоўстыя намёкі. Таму звяртайцеся да нас па дапамогу: мы хоць і еўрапейцы, але з расійскімі туземцамі на кароткай нагзе, зможам ім тоесёе папулярна растлумачыць пасвойму, задобрыць іх «вогненнай вадой» і суцешыць каляровымі пацеркамі. А без нас добрага бізнесу ў Расіі вам не мецъ...

Той-сёй лічыць цяперашнюю беларускую наменклатуру тугадумамі і троечнікамі, але хто, як не яна, зараз любіць фарсануць моднымі тэрмінамі «еўрапейская супольнасць», «еўрапейская эканамічная прастора», «агульнаеўрапейскія каштоўнасці» і г.д. Славалюбства беларускіх службоўцаў цешыць прыналежнасць да Еўропы. І хоць наша вертыкаль ужо спарылася ў чарговую «нерушымую дзяржаву» з Усходам, ёй хочацца і з Захадам больш трывалай сувязі (Вы ўяўляеце, якія пенсіі ў дэпутатаў Еўрапарламента? Вы ведаеце, што на Захадзе ніхто не гадзіць у пад'ездах, нягледзячы на дэмакратыю!).

Адным фактам сваёй дасягальнасці Еўропа творыць цуды з нашымі замшэлымі бюракратамі, ператвараючы іх у грамадзян свету. Напрыклад, адна начальніца над выбарамі раптам публічна прызналася, што любіць... Парыж. Яна на самай справе аматарка французскіх вытанчаных далікатнасцяў. Ёй блізкая еўрапейская культура і нават, магчыма, ідэалы Вялікай французскай рэвалюцыі. Долу Бастылію! Долу ўзурпатара! Свабода! Роўнасць! Брацтва! (Амаль што выбарчы слоган Аляксандра Мілінкевіча ў 2006 годзе).

Тым часам позіркі беларускіх службоўцаў пачынаюць звяртацца да Масквы з тайнай надзеяй, што і азіятам калі-небудзь захочацца ў Еўропу. Але Масква сама па сабе мроіцца Пупам Сусвету, і Беларусь у яе разліках значна ніжэй рангам.

І тут чароўная Еўропа, ужоззяючы развітальнымі карабельнымі агнямі, дае раптам Беларусі апошні шанец стаць роўнай сярод выбраннікаў, кідае на бераг канат. Вы хочаце ў Еўропу? Станьце крышку падобнымі да еўрапейцаў, ну хоць зрабіце выгляд. Вы доўга былі азіятамі і здзічэлі. Вымыйце рукі і твар, памяняйце шкарпэткі і, калі ласка, не смаркайцеся ў занавескі. Больш нічога ад вас не патрабуем.

Паўза... Тугадумы і троечнікі з адчаем пазіраюць на свайго бацьку, каторы сядзіць у чырвоным куце на залатым крэсле перад электракамінам у «чудовішчнай» напрузе. Вырашаецца каласальная задача: як аб'ягорыць Еўропу і Азію аднамомантна і ўвайсці ў сусветную гісторыю асобным радком.

Ат! Што тут думаць? Трэба мэсэджы дасылаць і тым, і гэтым. І нашым, і вашым. Калі што Еўропа замысліла, дык без мяне ў яе не нічога атрымаецца. А калі Азія нешта прыдумала, дык і ў яе нічога без мяне не атрымаецца. А са мной атрымаецца ва ўсіх. Галоўнае, каб са мной. Вось і ўся палітыка. Зразумела?

Ага! Ага! Зразумела, уздыхаюць тугадумы. Мы будуем МОСТ, а без бацькі таго МОСТА не будзе, а будзе тут ДЗІРКА.

І няўцям бедалагам, што ніяк не падобныя яны да будаўнікоў новага моста, а нагадваюць старцаў каля моста старога. Грымяць па гэтым мосце вазы з таварам, брэшуць сабакі, трашчаць дошкі, пыл стаіць слупам. А знізу ў брудзе стаяць сляпыя жабракі. Са зламанай катрынкай і з малпай на ланцугу...







Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 04.09.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.